Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і КК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЛЮТЫ 3 1934 г. СУБОТА № 28 (4361)

Год выдання XVII

„Справу жывёлагадоўлі павінны ўзяць у свае рукі ўся партыя, усе нашы работнікі, партыйныя і беспартыйныя, маючы на ўвазе, што праблема жывёлагадоўлі з'яўляецца цяпер такой-жа першачарговай праблемай, якой была ўчора ўжо вырашаная з поспехам праблема зернавая. Няма чаго і дказваць, што совецкія людзі, браўшыя не адну сур'ёзную перашкоду на шляху да мэты, здолеюць узяць і гэту перашкоду“ (СТАЛІН)

РЭЗАЛЮЦЫЯ XVII З'ЕЗДА ВКП(б) па справаздачнаму дакладу тав. Рудзутака аб рабоце ЦКК-РСІ

(Прынята аднагалосна)

Заслухаўшы справаздачны даклад тав. РУДЗУТАКА XVII з'езд ВКП(б) цалкам ухваляе дзейнасць ЦКК-РСІ

ВЫРАШЫЦЬ ПРАБЛЕМУ ТРАНСПАРТА

З'езд партыі даў рабоце чыгуначнага транспарта суровую ацэнку. «Транспарт,—гаварыў тав. Сталін, — з'яўляецца тым вузкім месцам, аб якое можа спатыкнуцца, ды, ма быць, пачынае ўжо спатыкацца ўся наша эканоміка, і, перш за ўсё, наш тавараразварот».

Затрудненні, якія стварае дрэнная работа транспарта для ўсёй народнай гаспадаркі, наўрад ці патрабуюць растлумачэння. Краіна траціць капасальныя матэрыяльныя каштоўнасці з-за таго, што своечасова не падвозяцца сыравіна і апал для прадпрыемстваў. Многія фабрыкі і заводы вымушаны штучна стрымліваць разгортванне вытворчасці, бо няма куды складваць гатовай прадукцыі, якая своечасова не вывозіцца. Дрэнная работа транспарта наймацней за ўсё б'е па тавараразвароту.

Задача рашучага паляпшэння работы транспарта стала адной з самых вострых і актуальных задач. Партыя за гэтыя гады здолела стварыць магутную сучасную індустрыю, якая стаіць цвёрда на нагах. Партыя стварыла буйную сацыялістычную сельска-гаспадарчую вытворчасць, якая таксама стаіць цвёрда на нагах. Але і прамысловасць і сельская гаспадарка не могуць развівацца самі па сабе, асобна адна ад другой. З'яўляючыся асноўнымі элементамі нашай эканомікі, яны ўзаемна дапаўняюць адна другую, і ў гэтай узаемнай сувязі знаходзяць сілы і крыніцу для новых дасягненняў.

Тавараразварот паміж горадам і вёскай, паміж раёнамі і абласцямі краіны, паміж рознымі галінамі народнай гаспадаркі, з'яўляецца тым неабходным звяном, якое побач з уздымам прамысловасці і ўздымам сельскай гаспадаркі прымушаюць біць крыніцаю ўсё эканамічнае жыццё краіны. Калі развіццё нашай эканомікі ўпіраецца ў развіццё тавараразвароту, то развіццё тавараразвароту ў сваю чаргу ўпіраецца ў транспарт. Тав. Сталін указаў на гэта з усёй праматой. Вось чаму з'езд партыі з такой рэзкасцю паставіў пытанне аб рабоце транспарта, выкараненні яго агрэмадных і застараўшых недахопаў.

Ніхто не можа сказаць, што партыя за гэтыя гады не аддавала транспарту ўвагі. Наадварот, транспарт атрымаў неабходнае падтрыманне, як матэрыяльнымі рэсурсамі, так і людзьмі. Але-ж справа арганізацыі гаспадаркі і кіраўніцтва ёю заключаецца не толькі і не столькі ў тым, каб атрымаць сродкі і сілы, а галоўным чынам у тым, каб правільна расставіць сілы і па большэвіцку кіраваць імі. А вось гэтага на транспарце і няма. Праўда, чыгункі павялічылі свой кругазварот, падняўшы яго з 133,9 млрд. тонакіламетраў у 1930 годзе да 172 млрд. тонакіламетраў у 1933 годзе, але гэтага не толькі мала для нашай эканомікі, гэта не адпавядае таксама і магчымасці транспарта.

Асноўная прычына нездавальняючай работы транспарта заключаецца ў дрэнная рабоце саміх транспартнікаў і перш за ўсё кіраўнікоў транспартнай гаспадаркі. «Не можа быць сумнення, — гаворыць тав. Сталін, — што ўсе віды транспарта маглі-б працаваць многа лепш. Калі-б органы транспарта не хварэлі вядомай хваробай, якая называецца канцылярска-бюракратычнымі метадамі кіраўніцтва».

Выключную па яснасці і пераканальнасці характарыстыку работы кіраўнікоў транспарта даў тав. Варашылаў у сваёй прамове на з'ездзе, паказаўшы ўзор расшыфроўкі сталінскіх палажэнняў. З'езд бурнымі апладысментамі выказаў сваю салідарнасць з характарыстыкай многіх кіраўнікоў транспарта, як «прафесараў, якія чытаюць лекцыі», а не камандзіраваў, закліканых устанавіць дысцыпліну, мяжуючую з ваеннай.

Адным з самых яркіх прыкладаў недысцыплінаванасці, нацвёрдасці, «бяруканасці» многіх кіраўнікоў транспарта з'яўляецца недаўняя гісторыя з агаленнем вагоннага парка паўднёвай дарогі. Магістраль, якая снабжае усю краіну данецкім апалам, у самы цяжкі перыяд года — у зімовы час — аказалася без вагонаў, якія загрузілі на другарадных дарогах з прычыны таго, што кіраўнікі гэтых дарог не лічылі патрэбным выконваць рэгулёравачны загад НКШЗ, а гэты апошні не знайшоў у сябе ні сілы, ні цвёрдасці, ні неабходнага аўтарытэта, каб забяспечыць выкананне жыццёва-неабходных распараджэнняў.

Значэнне рэгуляроўкі вагоннага парка на транспарце можна параўнаць з перакідкай войск на фронце для забеспячэння тых або іншых баявых аперацый. Наўжо можа ўзнікнуць у камандзіра чырвонаармейскай часці нават думка аб тым, каб сарваць або затрымаць выкананне аперацыйнага загада? Кожны з камандзіраў Чырвонай арміі не пашкадуе нічога, нават самога жыцця, каб выканаць такі загад з усёй дакладнасцю. А як паступаюць камандзіры транспарта ў непараўнальна больш пёгкай абстаноўцы? Яны скрозь і ўсюды або дазваляюць сабе дыскусіраваць загады, ад кладваючы выкананне іх у доўгі яшчык, або, фармальна згаджаючыся з імі, «спускаюць» іх уніз, не прыкладаючы ніякіх намаганняў, каб загад не астаўся пустой паперкай.

Транспарт, як ні адна другая галіна народнай гаспадаркі, засмечан непапраўнымі бюракратамі і канцылярыстамі, а таксама таго тыпу работнікамі, якіх тав. Сталін характарызаваў як «зазнаўшыхся вяльмож», не лічачых сваім абавязкам выконваць указанні Кіруючых органаў, і як балбатуноў, якія здольны патапіць любую жывую справу ў патоку вадзяністых, бясконцых прамоў і «очковтирательских» рапартоў.

Указанне тав. Сталіна аб знядці вельмож і балбатуноў з пастоў з перадводам на ніжэйшыя пасады павінна праводзіцца на транспарце з усёй рашучасцю.

На транспарце спрод гаспадарнікаў, інжынераў, адміністратараў ёсць не мала людзей, якія дастатково падрыхтаваны для замены негодных камандзіраў, і якія не заражаны канцыляршчынай. Трэба смялей выпучаць на кіруючыя пасты работнікаў, якія паказалі сябе здольнымі змагацца за новыя метады работы і перамагаць, не гледзячы ні на што.

Прамова тав. Сталіна, прынятая з'ездам, як пастанова аб чарговых задачах партыі, з надзвычайнай сілай прыкоўвае ўвагу ўсёй партыі да пытанняў арганізацыйнага кіраўніцтва, як асноўнай умовы нашых поспехаў. «Перамога ніколі не прыходзіць сама, — не звычайна прыцягваюць». Перамогу трэба арганізаваць, а галоўнае ў арганізацыі перамогі, у арганізацыйнай рабоце — гэта падбор людзей і праверка выканання.

Задача работнікаў транспарта заключаецца ў тым, каб ажыццявіць гэтыя ўказанні правадыра ў штодзённай практычнай рабоце.

Партыя стварыла на транспарце палітаддзелы, каб паскорыць і абегчыць ліквідацыю яго недахопаў. Палітаддзелы працуюць ужо на працягу некалькіх месяцаў і не мала зрабілі для выкрыцця сабатажу рашэнняў партыі і мабілізацыі мас. Але рэзультаты работы палітаддзелаў усё-ж нельга лічыць дастатковымі, паколькі работа транспарта да гэтага часу не выяўляе адзнак сур'ёзнага паляпшэння. Нельга не прызнаць, што палітаддзелы МТС здолелі разгарнуць сваю работу з куды большым поспехам.

Тлумачэння недастатковасці канкрэтных рэзультатаў работы палітаддзелаў на транспарце трэба шукаць не толькі ў тым, што новыя метады кіраўніцтва сустракаюць на транспарце велізорнае супраціўленне кансерватыўных элементаў, але перш за ўсё ў тым, што палітаддзелы не здолелі яшчэ належным чынам мабілізаваць шырокія масы чыгуначнікаў на барацьбу за перабудову транспарта, не здолелі яшчэ як след абапірціся на лепшыя перадавыя элементы.

У другой пяцігодцы чыгункі атрымліваюць новае магутнае тэхнічнае абсталяванне. Капітальныя ўкладанні на транспарце вырастаюць у параўнанні з першай пяцігодкай у некалькі разоў.

Партыя дае капасальныя сродкі, каб сацыялістычны транспарт у тэхнічных адносінах ні ў чым не ўступаў транспарту перадавых еўрапейскіх краін.

Атрымліваючы новае агрэмаднае падтрыманне, работнікі транспарта павінны сканцэнтраваць сваю ўвагу на тым, каб выкараніць у органах транспарта «бюракратычна-канцылярскія адносіны да справы і зрабіць іх больш аперацыйнымі».

Партыя паставіла ў парадак дня праблему транспарта і вырашыць яе, скінуўшы з сябе шляху ўсякага, хто так або інакш будзе перашкаджаць ёй у гэтай вялікай рабоце.

(«ПРАВДА»).

XVII З'ЕЗД ВКП(б)

Даклад мандатнай камісіі

ТАВ. ЕЖОЎ.

Пры выдачы мандатаў мандатная камісія кіравалася ўстаноўленай Цэнтральным Камітэтам партыі нормай прадстаўніцтва на XVII з'езд партыі: адзін дэлегат з правам рашаючага голаса на 1500 членаў партыі і адзін дэлегат з правам дарадчага голаса на 3 тыс. кандыдатаў.

У аснову вызначэння колькасці дэлегатаў па асобных партыйных арганізацыях мы ўзялі колькасць партыйных арганізацый на першае студзеня 1934 г., з упрэкам рэзультатаў чысткі па 70 арганізацыях, дзе яна праходзіла.

Усяго мандатная камісія зацвердзіла 1225 мандатаў з правам рашаючага голаса і 765 мандатаў з правам дарадчага голаса. Такім чынам, на з'ездзе прысутнічае ўсяго 1.961 дэлегат з рашаючым і дарадчым голасам. Гэта колькасць дэлегатаў прадстаўляе 1,872.488 членаў партыі і 935.298 кандыдатаў.

Калі супаставіць гэтыя даныя з колькасным складам XVI з'езда партыі, на якім прысутнічала 2.159 дэлегатаў (1.268 з правам рашаючага голаса і 891 з правам дарадчага голаса), прадстаўляўшых 1.200.874 членаў партыі і 711.609 кандыдатаў, дык трэба адзначыць, што колькасны склад XVII з'езда, не гледзячы на рост партыі, з'яўляецца некалькі меншым, асабліва ў адносінах дэлегатаў з правам дарадчага голаса. Тлумачыцца гэта тым, што норма прадстаўніцтва на XVII з'езд павышана (вядома, што на XVI з'езд адзін дэлегат з правам рашаючага голаса выбіраўся ад тысячы членаў партыі і адзін дэлегат з правам дарадчага голаса ад двух тысяч кандыдатаў). У адносінах мандатаў з правам рашаючага голаса мандатная камісія самым строгім чынам прытрымлівалася ўстаноўленай ЦК нормы прадстаўніцтва, у рэзультаце чаго на адзін мандат з рашаючым голасам прыходзіцца 1528 членаў партыі ў сярэднім. Дарадчыя мандаты размяркоўваюцца наступным чынам: работнікі цэнтральных устаноў, не лічачы членаў ЦК і ЦКК, атрымалі 166 мандатаў, ці 23 проц., члены ЦК і ЦКК атрымалі 175 мандатаў, ці 24 проц. і мясцовыя арганізацыі атрымалі 395 мандатаў, ці 53 проц. Такім чынам, асноўную масу мандатаў з правам дарадчага голаса атрымалі месцы, асабліва калі ўлічыць, што члены ЦК і ЦКК у значнай сваёй частцы з'яўляюцца работнікамі мясцовых партарганізацый.

Што датычыць колькасці мандатаў з правам дарадчага голаса, прадстаўленых работнікам цэнтральных устаноў, дык яна значна скарочана. Калі на XVI з'ездзе партыі гэтым работнікам было выдана 238 мандатаў, дык на XVII — усяго 166 мандатаў.

Такава характарыстыка агульнай колькасці ўдзельнікаў з'езда.

Цяпер некалькі заўваг аб складзе дэлегатаў з'езда па асноўных якасных паказальніках (гэтыя даныя прыводзяцца толькі на дэлегатаў з правам рашаючага голаса).

Першае пытанне — наколькі абнавіўся склад удзельнікаў з'езда. Упершыню на з'ездзе з правам рашаючага голаса прымае ўдзел 598 дэлегатаў — 46,5 проц. Гэта лічба паказвае, што за справаздачны перыяд партыя высунула новы велізарны слой партыйнага актыва на кіруючую работу.

У асаблівасці характэрна гэта выпуканне для такіх партыйных арганізацый, як маскоўская і ленінградская, у складзе якіх мы маем най большую ўдзельную вагу дэлегатаў, якія ўпершыню прымаюць удзел на з'ездзе: па маскоўскай арганізацыі — 51 проц., па ленінградскай — 49,5 проц.

Асобна трэба адзначыць значную колькасць упершыню прымаючых удзел на з'ездзе ў складзе дэлегацый нацыянальных рэспублік, напрыклад. Закаўказзе дае 53,8 проц. у першыню прымаючых удзел на з'ездзе, Сярэдняя Азія дае 31,7 проц.

Наступнае пытанне — аб партыйным стажы дэлегатаў. Калі характарызаваць склад дэлегатаў з правам рашаючага голаса па партыйнаму стажу, то трэба адзначыць перш за ўсё, што 80 проц. удзельнікаў з'езда з правам рашаючага голаса ўступілі ў партыю ў гады падполля і грамадзянскай вайны, г. зн. да 1920 года ўключна. 75 проц. са складу дэлегатаў з'езда з рашаючым голасам прымала ўдзел ад грамадзянскай вайны. Характэрна, што ўдзельная вага падпольшчыкаў і членаў партыі са стажам да 1920 г. у складзе ўсёй партыі раўняецца ўсяго толькі 10 проц., у той час як на з'ездзе іх прысутнічае 80 проц.

Такім чынам, за гэтым асноўным праверанным слоем членаў партыі, прайшоўшым школу грамадзянскай вайны і падполля, ставецца кіруючая роля. Пры гэтым важна ўлічыць, што ў данай групе дэлегатаў з рашаючым голасам падпольшчыкі складаюць 22,6 проц., члены партыі з 1917 г. — 17,7 проц.

Астатнія ўдзельнікі з'езда размяркоўваюцца па партыйнаму стажу наступным чынам: з 1921 г. па 1923 год — 4 проц., з 1924 па 1928 — 13,4 проц., з 1929 і пазней — 2,6 проц.

Важна спыніцца на пасобных партыйных арганізацыях. Напрыклад, маскоўская арганізацыя ў складзе сваіх дэлегатаў з рашаючым голасам мае 31,8 проц. падпольшчыкаў і 7,4 проц. членаў партыі, уступіўшых пасля 1920 года. Тут характэрна, што, захоўваючы кіруючую ролю за асноўным партыйным актывам, маскоўская партыйная арганізацыя здолела высунуць новыя пласты членаў партыі на кіруючую работу. Аналагічны працэс мы назіраем і па іншых партарганізацыях, у прыватнасці па ленінградскай і уральскай.

Гаворачы аб партстажы ўдзельнікаў з'езда, трэба адзначыць, што колькасць выхадцаў з іншых партый у параўнанні з папярэднімі з'ездамі і ў прыватнасці з XVI з'ездам прыкметна зменшылася і складае ўсяго 8,6 проц.

Па сацыяльнаму стану асноўную масу дэлегатаў з'езда складаюць рабочыя. У складзе дэлегатаў, з правам рашаючага голаса рабочых — звыш 60 проц. і сялян — 8 проц. Удзельная вага рабочых, якія працуюць непасрэдна на вытворчасці, у складзе дэлегатаў з правам рашаючага голаса складае 9,3 проц. і калгаснікаў — каля 2-х проц. Найбольшую колькасць дэлегатаў — рабочых ад варштата дала маскоўская партыйная арганізацыя, у складзе якой — 12,3 проц. рабочых ад варштата.

Найбольшую масу сярод рабочых па сацыяльнаму стану складаюць былыя метапісты, іх на з'ездзе 20,5 проц., астатнія таварышы размяркоўваюцца паміж гарнякамі, тэкстыльшчыкамі, друкарамі, чыгуначнікамі і інш.

Цікавы даныя аб характары выконваемай дэлегатамі работы. Дэлегаты з рашаючым голасам, якія працуюць у партыйных органах, на з'ездзе прысутнічаюць у колькасці 497 чалавек, або 40 проц., работнікаў савецка-адміністрацыйных органаў — 126 чалавек або 10,2 проц., работнікаў сельскай гаспадаркі — 121, або 10 проц., ваенных органаў — 90 чалавек, або 7,2 проц. і работнікаў транспарта — 75 чалавек, або 6 проц.

Калі супаставіць гэтыя лічбы са складам удзельнікаў на XVI з'ездзе, то мы маем наступную карціну: рэзка павялічылася колькасць удзельнікаў з'езда, працуючых у сельскай гаспадарцы, якіх было на XVI з'ездзе 13 чалавек, або 1,3 проц., у той час як зараз — 125 чалавек.

Такое-ж павялічэнне даюць работнікі транспарта. На XVI з'ездзе іх налічвалася 5-6 чалавек і яны складалі 0,2 проц.; на XVII з'ездзе — 75 чалавек — 6,2 проц.

Такое-ж прыкладна павялічэнне даюць і работнікі прамысловасці. Калі ўзяць асобна работнікаў партыйных органаў, то апрача сакратароў крайкомаў, абкомаў і ЦК нац компартый, мы маем на з'ездзе з правам рашаючага голаса 140 сакратароў гаркомаў і гаррайкомаў, 121 сакратар сельскіх раёнаў і 50 сакратароў партыйных камітэтаў на прадпрыемствах.

Асобна трэба спыніцца на колькасці ўдзельнікаў з'езда — работнікаў палітаддзелаў МТС, саўгасаў і транспарта. Усяго работнікаў палітаддзелаў з правам рашаючага голаса прымае ўдзел на з'ездзе 168 чалавек, з іх нач. палітаддзелаў МТС — 72, нач. палітаддзелаў саўгасаў — 16, нач. палітсектароў МТС — 21, нач. палітаддзелаў чыгунак і чыгуначных раёнаў — 51.

Такаво, таварышы, становішча са складам удзельнікаў з'езда па характару выконваемай імі работы.

У адносінах асветнай падрыхтоўкі дэлегатаў з'езда трэба адзначыць, што ў параўнанні з XVI з'ездам партыі рэзка павялічылася колькасць дэлегатаў, якія маюць закончаную вышэйшую і сярэднюю асвету. Калі на XVI з'ездзе партыі сярод дэлегатаў з рашаючым голасам, маючых вышэйшую асвету, было ўсяго 4,4 проц., то зараз гэты процант даходзіць да 10. Маючых сярэднюю асвету на XVI з'ездзе было 15,7 проц., зараз гэты процант павысіўся да 31. Больш паловы маючых вышэйшую і сярэднюю асвету дэлегатаў маюць закончаную тэхнічную асвету. Асабліва характэрным з'яўляецца тое, што ў складзе гэтых таварышоў, маючых вышэйшую і сярэднюю асвету, 40 проц. скончылі навучальныя установы ў гады першай пяцігодкі.

Такое-ж становішча мы маем і ў адносінах партыйна-палітычнай асветы дэлегатаў. Маючых закончаную партыйна-палітычную асвету сярод дэлегатаў з рашаючым голасам 265 чалавек — 21,6 проц., з іх скончылі ІЧП — 37, курсы марксізма — 118, Свердлоўскі універсітэт і іншыя комвузы — 100. На XVI з'ездзе ўсяго дэлегатаў, маўшых закончаную палітычную асвету, было 175 чалавек — 14 проц. усіх удзельнікаў з'езда: скончылі ІЧП — 5 чалавек, курсы марксізма — 79, комвузы — 95 чалавек.

Некалькі слоў аб жанчынах. У складзе дэлегатаў з рашаючым голасам 89 жанчын — 7,2 проц.

ГАЛАСЫ З МЕСЦ: Мала, мала!

ЕЖОЎ — Так, мала. Звыш паловы жанчын дэлегатаў, прысутных на з'ездзе, падае на Маскоўскую, Ленінградскую і Іваноўскую вобласці.

НІКАЛАЕВА: З Заходняй Сібіры?

ЕЖОЎ — і Заходня-Сібірскі край. Жанчыны гэтых дэлегацый складаюць 61 проц. усіх жанчын з рашаючым голасам, прысутных на з'ездзе.

Ніводная жанчына з правам рашаючага голаса не выбрана Крымская АССР, маючая 14 дэлегатаў, Паўночна-Каўказкі край, маючы 26 дэлегатаў і Свердлоўская вобласць, маючая 35 дэлегатаў.

Такавы, таварышы, асноўныя даныя аб складзе удзельнікаў з'езда. (АПЛАДЫСМЕНТЫ).

ПАВЕДАМЛЕННЕ КАМІСІІ ПА РАССЛЕДВАННЮ ПРЫЧЫН ГІБЕЛІ СТРАТАСТАТА „АСОАВІЯХІМ-1“

У рэзультаце работы камісіі на месцы катастрофы, зараз можна лічыць устаноўленым ніжэйнаступнае:

1. Гандола стратастата ўпала не далёка ад вёскі Поціж-Острог, 1-гарскага раёна, у 16 кілометрах на ўсход ад станцыі Кадошкіно, Маскоўска-Казанскай чыгункі (у 40 кілометрах ад ст. Рузаеўкі). Экіпаж у складзе т. т. ФЕДАСЕЕНКА Д. Ф., ВАСЕНКО А. В., УСЫСКІНА І. Д., знойдзен у гандоле мёртвым.

Частка пілотных і навуковых прыбораў, якія знаходзіліся ў гандоле, аказалася разбітай, частка прыборыў знойдзена ў напалову разбураным стане і патрабуе далейшага даследвання.

Запісы ўсіх трох удзельнікаў палёту, а таксама рэгістрацыя барографа, запісанага пісак унутры гандолы, аказаліся ў поўнай захаванасці.

На аснове знойдзеных і дакладна даследаваных матэрыялаў камісія ўстанаўляе:

а) У 12 г. 33 мін. стратастат «АСОАВІЯХІМ—1» дасягнуў найбольшай вышыні — 22.000 метраў. На гэтай вышыні затрымаўся да 12 г. 45 мін., пасля чаго пашоў на зніжэнне.

б) Запісы бартовага журнала вялося рэгулярна да 16 г. 07 м. Апошняя запіс адносіцца к 16 г. 10 м. і гэты час камісія лічыць пачаткам катастрофы.

в) Па запісах барограмы разбітага барографа камісіяй устаноўлена, што барограф перастаў працаваць у 16 г. 21 м. Стролкі на зной дзеным на мерцы катастрофы кішэнковым гадзіннику, які належаў т. ВАСЕНКО, спыніліся ад удара на 16 г. 23 м. Усе апытаныя жыхары таксама паказваюць час падзення гандолы на зямлю. — 16 гадзін з мінутамі.

На аснове вышэйвыкладзенага камісія ўстанаўлае, што ўдар гандолы аб зямлю адбыўся ў 16 г. 23 мін.

Прычынай катастрофы з'яўляецца праграмная, праграсіўна-ўзрастаючая скорасць зніжэння стратастата, якая пачалася ў 16 г. 10 м. з вышыні 12.000 метраў, выклікаўшая, відавочна, у далейшым разрывы часткі строп і парушэнне роўнавагі ўсёй сістэмы, у выніку чаго гандола, якая адарвалася ад абалонкі, з сілай ударылася аб зямлю ў 16 г. 23 м.

Устаноўлена, што каманда, якая знаходзілася ў стратастаце загінула ў выніку ўдару гандолы аб зямлю.

Ніякіх прызнакаў абледзянення на абалонцы і гандоле стратастата не ўстаноўлена. У раёне спуску назіраліся разрывы воблакаў, праз якія пілоты, згодна запісам, бачылі зямлю і сам стратастат быў відаць у асобныя моманты з земнай паверхні. Такім чынам апублікаваная ў «Правде» ад 31 студзеня радыёграма, прынятая радыёстанцыямі ў раёне Гомеля і паведамляўшая аб абледзяненні стратастата і цяжкім стане ўдзельнікаў палёту не адпавядае сапраўднасці і, віта вочна, радыст аказаўся ахвярай нейкай містыфікацыі.

З усіх захаваўшыхся запісаў вынікае, што за ўвесь час палёту ад пачатку да 16 гадзін 10 мінут экіпаж стратастата меў бадзёры настрой і цвёрдую ўпэўненасць у добрым спуску.

Па запісах і астатках прыбораў удалося ўстанавіць вялікую навуковую работу, праведзеную ўдзельнікамі палёту стратастата.

Камісія працаўжае далейшае вывучэнне знойдзеных матэрыялаў і ўдасканаленняў і вызначэння ўсіх акалічнасцей катастрофы.

Камандзір стратастата «СССР» Г. А. ПРАКОФ'ЕЎ.

Прафесар П. А. МАЛЧАНАЎ.

Інжынер В. А. СЕМЕНАЎ.

Інжынер Ю. Т. ПРЫЛУЦКІ.

І. І. САСНОЎСКІ, З. І. ВАЛОВІЧ.

Ст. Кадошкіно, 1 лютага 1934 года 3 г. раніцы.

КАЛЯ УРН ЗАГІНУЎШЫХ ГЕРОЯЎ

МАСКВА, 2 лютага. (БЕЛТА).

Учора ўвечары астанкі загінуўшых герояў стратасферы — т. т. ФЕДАСЕЕНКА, ВАСЕНКО і УСЫСКІНА — былі дастаўлены ў Маскву.

У 19 гадзін 05 мінут павольна падходзіць да перона Казанскага вакзала абвіты чырвонай матэрыяй і жалобным крэпам паравоз. Наперадзе — па баках паравоза — застылі ў гаварووай варце два чырвонаармейцы. Аркестр выконвае жалобны марш. Удоўж перона — гаварووая варта курсантаў школы ЦВК РСФСР, сваякі, прыяцелі і таварышы загінуўшых, прадстаўнікі пролетарскай грамадзянскай, ад казныя работнікі Асоавіяхіма.

Поезд плаўна спыняецца. З вагона выносяць абітыя чырвоным шоўкам і тонучыя ў кветках труны — т. т. Федасеенко, Васенко, Усыскіна. Праз рады гаварووай варты сваякі і прыяцелі правяджаюць астанкі герояў.

На плошчы каля вакзала — гаварووая варта, галоўны прапоўных. Труны ўстанаўляюцца на аўтамабілі. Над труннамі сліняюцца сцягі. Жалобная калона рушыцца к месту кремацыі...

***

Урны з прахам т. т. ФЕДАСЕЕНКА, ВАСЕНКО І УСЫСКІНА устаноўлены ў будынку ЦВК СССР на Красвай плошчы.

МАСКВА, 2 лютага. (БЕЛТА).

Вестка аб тым, што астанкі загінуўшых герояў стратасферы дастаўлены ў Маскву, абляцела горад з быстратой маланкі. Задоўга да таго, як урны з прахамі былі перавезены ў будынак ЦВК СССР, на Красвай плошчы, перад увахопам у будынак, сабраліся тысячы працоўных, якія прышлі аддаць апошні доўг загінуўшым на баявым пасту.

Вялікая зала пасяджэнняў ЦВК СССР у жалобе. Сярод залы на пастаменце абвітыя крэпам урны. Вакол пастамента—вянкі, пальмы, жывыя кветкі. Аркестр выконвае жалобны марш.

У першых зменах гаварووай варты — лепшыя ўдарнікі вытворчасці і абароны — рабочыя буйнейшых фабрык і заводаў Масквы.

***

МАСКВА, 2 лютага. (БЕЛТА).

Старшыня ЦС Асоавіяхіма т. Эйдэман атрымаў з Волагды ад экіпажа «Аэрастат СССР» наступную тэлеграму: «Экіпаж «Аэрастат СССР», які знаходзіцца ў палёце ў раёне Волагды, прыняўшы паведамленне аб катастрофе стратастата «Асоавіяхім», горача спачувае па поводу адбылайся страты. Гатовы правесці новы подзём у стратасферу ў імя загінуўшых таварышоў.

ПАПОЎ, КАНАВАЛЬЧЫК.

ПОМНІК ГЕРОЯМ СТРАТАСФЕРЫ

МАСКВА, 2 лютага. (БЕЛТА).

Цэнтральны Совет Асоавіяхіма пастанавіў на тэрыторыі Маскоўскага цэнтральнага аэраклуба пабудаваць помнік у гонар трох загінуўшых герояў стратасферы — т. т. ФЕДАСЕЕНКА, ВАСЕНКО, УСЫСКІНА.

***

Гандола стратастата «Асоавіяхім» пастановай прэзідыума Цэнтральнага Совета Асоавіяхіма перадана ў распараджэнне лётнага атрада вайсковай часці, якою камандуе камандзір стратастата «СССР» т. ПРАКОФ'ЕЎ.

СПАЧУВАННЕ АЭРАКЛУБА ПОЛЬСКАЙ РЭСПУБЛІКІ

Асоавіяхімам атрымана наступная тэлеграма з Варшавы: «Патрасёныя трагічнай катастрофай геройскіх піонераў аэрапаўтыкі, спяшаемся выказаць шчырае спачуванне.

АЭРАКЛУБ ПОЛЬСКАЙ РЭСПУБЛІКІ.

Пятрусь Броўка

МЫ ВАШУ АДВАГУ ПОМНІМ...

Памяці Паўла Федасеенка, Андрэя Васенко і Ільі Усыскіна — герояў стратасферы

Мы чулі вас тут,
на совецкай зямлі,
і сэрца прымала
мільёны ударaў.
Мы чулі вас тут
і мы з вамі былі —
адважныя,
тры комунары.
Граніц
для совецкіх герояў
няма,
Вы з небам
схапіліся ў спрэчкі —
І доўга услед вам
глядзеў Эйдэман,
чакаючы
блізкай сустрэчы.
А вы,
дзе раней
не было ні душы —
паставілі
новую прыстань.
І кожны з вас
сэрцам на з'ездзе жыў
з адданасцю
комуніста.
Ваш голас ляцеў,
міжпланетна кружыў...
(да Марса
напягнуты струны).
Вы першыя ў свеце
з нячутных вышынь
свой марш
праспявалі Комуне.
Вы слалі вітэшні
Маскве многа раз,
Вы горача шчасця
жадалі нам.

Вы палка віталі
правадыра
над светам
Іосіфа Сталіна.
І стукаў аднолькава з вамі
наш пульс —
адзіным каханнем
сагрэты.
І быў у далоні
Совецкі Саюз
і ўсе пролетары
планеты.
Мы вас,
на зямлі тут,
чакалі хуттэй,
да вуснаў каб вашых
прынікнуць...
Але стратасфера
не ўзята яшчэ —
там ёсць
Калчакі і Дзенікіны.
Яны абкружылі гандолу,
што жах,
яны павязалі
вам рукі.
І з гонарам палі вы
ў новых баях —
на фронце
совецкай навукі.
Але не спужаліся
мы перашкод
І ваша геройства
мы помнім —
Мы больш узяцім
як на 20.600
і гэтым
паставім
вам помнік.

XVII З'ЕЗД ВКП(б)

Спрэчкі па справаздачнаму дакладу т. СТАЛІНА аб рабоце ЦК ВКП(б)

З прамовы тав. МІКАЯНА

Тав. Сталін у сваім дакладзе разгарнуў гіганцкую карціну вялікай будоўлі сацыялізма паміж XVI і XVII з'ездамі партыі, якая прадстаўляе сабой цэлую эпоху ў гісторыі чалавецтва. Калі партыя на чале з т. Сталіным да XVI з'езда ў схватцы з апартуністамі «левых» і правых адстойвала і абгрунтоўвала ленінскую тэорыю аб будаўніцтве сацыялізма ў адной краіне, то за час паміж XVI і XVII з'ездамі ўся партыя па справе даказала бясспрэчнасць гэтай тэорыі, заклаўшы ўжо моцны фундамент і ўзводзячы сцены ўсяго будынка сацыялізма.

Найбольшыя труднасці пролетарскай рэвалюцыі былі ў галіне сельскай гаспадаркі. І тут т. Сталін, адстойваючы ленінскую тэорыю, узбагаціў, развіў яе тым, што даў нашай вёсцы калгасную арцельную форму арганізацыі, даў шляхі ліквідацыі апошняга класа эксплаататараў—кулакоў і гэтым самым прывёў нашу краіну да найвялікшых перамог сёнешняга дня.

Тав. Сталін, як геніяльны стратэг, перш чым весці партыю ў наступленне на кулака, зрабіў апаліз класавых сіл на вёсцы. У гутарцы са слухачамі інстытута чырвонай прафесуры ў 1928 г. ён сказаў:

«не трэба забываць, што калі ў індустрыі мы можам процістаўіць дробнаму капіталісту ў горадзе буйную сацыялістычную прамысловасць, якая дае дзевяць дзесятых усёй масы прамысловых тавараў, то буйнай кулацкай вытворчасці на вёсцы мы можам процістаўіць па лініі вытворчасці толькі неўмаўнаныя яшчэ калгасы і саўгасы, якія даюць у 8 раз менш хлеба, чым кулацкія гаспадаркі.

Не разумець значэння буйнай кулацкай гаспадаркі на вёсцы, не разумець таго, што ўдзельная вага кулацтва на вёсцы ў сто крат вышэй, чым удзельная вага капіталістаў у гарадской прамысловасці, г. зн. страціць розум, парваць з ленінізмам, перабегчы на бок ворагаў рабочага класа».

За гэтыя гады адбылася карэнная перастаноўка класавых сіл і ў зернавой і ў жывёлагадоўчай гаспадарцы, і ў галіне вытворчасці тэхнічных культур, бо партыя, кіруемая т. Сталіным, праводзіла цвёрдую ленінскую палітыку, вядучы з усімі відамі апартуніста рашучую барацьбу.

У нашых поспехах у галіне сельскай гаспадаркі немалую ролю адыграў закон аб абавязковых пастаўках сельгаспрадукту калгасамі дзяржаве, прыняты па ініцыятыве т. Сталіна. Ранейшая сістэма кантрактацыі не давала дастатковага стымула калгасам здабываць больш прадукцыі. Перамога соўгасаў і калгасаў плюс новы закон далі нам велізарную сілу. Закон аб зернапастаўках, аб пастаўках малака і мяса лепш за ўсё спалучае асабістыя інтарэсы калгаснікаў з агульнымі інтарэсамі дзяржавы. Гэта з'яўляецца новай, найлепшай формай эканамічнай сувязі рабочай дзяржавы з калгасным сялянствам на вышэйшай стадыі нэпа.

Гэты закон падвёў моцную базу пад высунуты раней лозунг калгаснага гандлю. Гэты закон, устанаўляючы новую форму ўзаемаадносін дзяржавы з вёскай, даў велізарны стымул для павялічэння вытворчасці і стварыў дадатковыя фонды для калгаснага гандлю.

У мінулым годзе вясной, калі рынкавыя цэны сталі моцна падымацца, не толькі на Украіне і ў іншых раёнах, але нават і ў Маскве, т. Сталін даў надзвычайную ідэю, надзвычайную сілу ў нашы рукі, прапанаваўшы разгарнуць гандаль дзяржаўным хлебам і іншымі прадуктамі ў нашых магазінах, каб знізіць цэны на калгасным рынку. Наркамснаб пачаў вольную продажу хлеба ў Маскве, Ленінградзе, Харкаве, Кіеве і іншых гарадах. Тав. Сталін ўжо даклад даў вам, што Наркамснаб праводзіць гандаль хлебам у 330 гарадах Саюза, не лічачы таго, што Цэнтрасаюз, купляючы хлеб, ужо праводзіць продажу хлеба ў 179 рабочых цэнтрах.

Апрача хлеба, мы пачалі гандляваць мясам, каровім маслам і малаком і адкрылі пераважна буйныя магазіны па гандлю другімі прадуктамі харчавання першагатункавай якасці ў Маскве, Ленінградзе, гарадах Данбаса і Дняпропятроўску.

На сёння ў нас па ўсёй краіне працуе 5.600 магазінаў Наркамснаба, дзе вольная продажа прадукты, а вольная продажа вычыкала падзенне цэн на мясо, масла, агародніну і іншыя тавары.

Якое ўзрастанне аказваюць гэтыя магазіны на калгасніка і калгасны рынак, відаць хоць-бы з апошняга прыкладу, які я на іншых прыводжу па Маскоўскай раённай партыйнай канферэнцыі.

У чэрвені мінулага года мы пачалі ў Маскве і Ленінградзе гандаль малаком, у мэтах узрастання на рынкавыя цэны. Мы назначылі цану на 30-40 проц. ніжэй рынкавай. Рынкавая цана адразу скацілася ўніз да ўзроўню дзяржаўных цэн і нават ніжэй. Пры адпускавай цане спажывец купляў малако ў дзяржаўнай палатцы ахвотней ведаючы, што ў дзяржаўных магазінах ёсць поўная гарантыя ад фальсфікацыі, і малако захоўваецца ў гігіенічных умовах. Па апошным з рынкаў калгаснікі парашылі нас «абыйсці» і назначылі цану значна ніжэйшую за нашу, і ўсё-ж такі ў іх мала купілі. Тады яны адвезлі свайго прадукта ў белы фартух, прымусілі чыста вымыць рукі і спажыўцы сталі купляць у калгасніка ахвотней, чым у нас. Супроць такога «абходу» дзяржавы, мы ведома нічога не маглі супярэчыць (**СМЕХ**) і зніжэлі цану з свайго боку, спусціўшы гэтым самым калгасную цану яшчэ ніжэй. Калі я тав. Сталіну расказаў аб гэтым, ён хахатаў і гаварыў: «Вось да чаго давялі калгасніка—да белага фартука» (**смех**).

Такім чынам, мы ніякай лепшай калгаснікам не чыталі, ніякіх дыректыў аб зніжэнні цэн не пісалі, мы сваім эканамічным вагаром, удалым мерапрыемствам, прапанаваным т. **Сталіным**, цэны знізілі і калгаснікаў вучым гандляваць культурней.

Тав. Сталін, крытыкуючы работу гаспадарчых органаў, зусім справядліва бічаваў канцылярска-бюракратычныя метады кіраўніцтва. Відома, гэтага дабра ў нас у лёгкай і харчовай прамысловасці не мала і толькі дзякуючы гэтаму мы многа ўпускалі і ўпускаем. Я павінен прама сказаць, што аб дрэнцай якасці нашых тавараў я даведваюся не праз канцылярыю, —яна ўсё абязлічвае, пераводзячы на тоны, за якімі часта невядома, што хаваецца.—а тады, калі гаворыць мясцовыя работнікі, або калі сам набываю на прадпрыемствах, у магазінах і паслухаю работнікаў прадпрыемстваў і прыладка, якія вецаюць добра справу.

Многія гаспадаркі лічаць, што для ўнутранага рынка і дрэнпае сойдзе, тым больш, што сур'ёзных скаргаў няма, усё сыходзіць гладка і беспакарана, а дрэнныя і ніжэйшыя гатункі тавараў рабіць куды лягчэй і без клапот, чым рабіць першагатункоў тавар. Сямтам апартуністы з гаспадарнікаў замест чэснага выканання лозунга партыі аб зніжэнні сабекошту і павышэнні прадукцыйнасці прадпрыемстваў, прыкрываючыся гэтымі лозунгамі для пагоршання якасці тавараў, ведома, кожны раз запасаюцца адпаведнымі «аб'ектыўнымі» прычынамі.

Наркамснаб ужо даўно разгарнуў большэвіцкую барацьбу з гэтымі ганебнасцямі ў галіне харчовай прамысловасці. Сёе-тое напрацілі ўжо, але многа яшчэ астаецца такога, што патрабуе ўпартай і ўпартай работы.

Гандлёвая сетка, магазіны павінны стаць барацьбітамі за добрую якасць тавараў, павінны ўзяць па сябе абарону інтарэсаў спажыўца ад асобных фабрык, якія пагаршаюць якасць сваёй прадукцыі. Нядаўна адкрыт у сістэме Наркамснаба ўнівермаг Масторга можа служыць прыкладам таго, як магазін павінен змагацца за лепшую якасць прамтавараў.

Цяпер ва ўнівермагах Масторга і Хаторга мы маем больш 10 тыс. розных гатункаў прамтавараў, у той час як у звычайным універсальным магазіне колькасць назвай не дасягае і 4-х тысяч. Такім чынам, вы бачыце, таварышы, што магазіны вольнай продажы з'яўляюцца для нас адначасова і вагаром у справе барацьбы за добрую якасць тавараў на рынку. Задача падвышэння і патрэбнага вытворчасці тавараў шырокага спажывання, настаўленая т. **Сталіным**, не можа быць вырашана без гэтага, бо мы павінны даваць ва ўдвоенай і ўтроенай колькасці тавары лепшай якасці.

Апрача разгортвання дзяржгандлю і вольнай продажы прадуктаў з магазінаў, Наркамснаб за прадпоўны час па ініцыятыве т. Сталіна, перабудаваў справу закрытага рабочага спажывання, перадаўшы яго завочнаўпраўленню з арганізацыяй у іх складзе ОРС'аў.

Прапанова т. Сталіна аб арганізацыі ОРС'аў — надзвычайная прапанова; яна карэнным чынам палепшыла справу рабочага спажывання і дала магчымасць поўнасцю правесці ў жыццё ільічоўскую ўстаноўку аб упарэдстве ў рабоце з ўдарніцтве ў спажыванні.

Зараз ОРС'ы ахапляюць: па НКПС 100 проц. усіх рабочых, па Наркамцяжпрому — 70 проц. усіх рабочых, у тым ліку: нафта —100 проц., торф—100 проц., гумовая прамысловасць—100 проц., вугаль — 98 проц., лясная прамысловасць — 100 проц., Наркомлегпром — 45 проц., у тым ліку: тэкстыль — 70 проц., запалкавая прамысловасць — 62 проц.

ОРС'ы палепшылі справу рабочага спажывання, зняўшы прыхільбацеляў, аб чым ужо гаварыў тав. Сталін, і мабілізаваўшы значныя дадатковыя фасурсы.

Я звярачаю вашу ўвагу на размеры ўласных прыгарадных і жывёлагадоўчых гаспадарак таварышоў арганізацый. Па пасеву і прадукцыі гародніны і бульбы прыгарадныя гаспадаркі больш за ўсё соўгасы разам узятыя па пагалоўю жывёлы — больш чым было ў соўгасах у 1928 г.

Больш 150 млн. пудоў агародніны і бульбы атрымана дадатковага для спажывання рабочых ад уласных гаспадарак. Апрача таго, больш мільёна пудоў мяса і больш 176 тон малака ў якасці дадатковага фонда спажывання атрымана ад уласных жывёлагадоўчых гаспадарак.

Не гледзячы на ўсе палепшэнні ў справе пастаноўкі закрытага гандлю, трэба сказаць, што сістэма картак і закрытых размеркавальнікаў стварае спрыяючую абстаноўку для бюракратызма і злоўжываньняў. Вось чаму патрэбна сістэматычная барацьба і кантроль, каб не дапусціць разлажэння работнікаў і скажэння сістэмы.

Пакуль што нам прыходзіцца, і надоўга яшчэ прыдзецца, побач з захаваннем закрытага пайковага спажывання, разгарнуць свабодную продажу у дзяржаўных магазінах прадуктаў харчавання і прамтавараў, каб тым самым рашчысціць поле для сапраўднага гандлю, аб якім гаварыў т. Сталін.

Такім чынам, вольная продажа прадуктаў, арганізаваная Наркамснабам па ініцыятыве т. Сталіна, паміма таго, што яна з'яўляецца важнейшым вагаром эканамічнай інтэрвенцыі і стварае школу совецкага гандлю, гэты гандаль, паступова расшыраючыся і зніжаючы ў будучым рынкавыя цэны, пойдзе на змену сістэме закрытага гандлю.

Таварышы! Тав. **Сталін** у сваёй справаздачы падняў пытанне аб совецкім гандлі на вялікую выпыню і разбіў найбольш шкодны ўхіл яшчэ неасзнаны, нефармуляваны, неарганізаваны, але небяспечны таму, што ён шырока пашыран і прыкрываецца архіскупністычнымі фразамі. Я гаварыў аб дваранска-пагардлівых адносінах да гандлю.

У многіх гэтыя пагардлівыя адносіны да гандлю звязаны з няпра вільным улучэннем аб работніках гандлёвага апарата. Многія лічаць, што гандлёвыя работнікі або былыя гандляры, або мала ад іх адрозніваюцца. На справе малюнак зусім іншы.

Пераважная большасць гандлёвых работнікаў — гэта людзі, пас тушіўшыя на работу ў гандаль у час рэвалюцыі. Частка з іх заражана старымі звычкамі, з якімі трэба змагацца, але ў большасці гэта людзі, якія хочуць працаваць добра, але якія маюць мала вопыту сапраўднай гандлёвай работы. Сістэма картачнага гандлю з усімі бюракратычнымі недахопамі замест таго, каб выхоўваць добрых работнікаў, многа псуе. Перавыхаваць гэтыя кадры, пабольшэвіку, у такой складанай абстаноўцы як гандлёвая абстаноўка, зрабіць з іх сапраўдных совецкіх, большэвіцкіх гандляроў — гэта задача, якую партыя бескумоўна вырашыць з поспехам па аснове ўказанняў т. **Сталіна**.

Калі мы адкрывалі новыя магазіны вольнай продажы для таго каб ўцягнуць у гэтыя магазіны лепшыя кадры работнікаў і замацаваць іх, мы прапанавалі даць некаторы большую заработную плату работнікам гэтых магазінаў. Тав. Сталін прапанаваў плаціць яшчэ больш, чым у нас было намечана.

Тав. Сталін нанёс знішчальны ўдар усім барска-пагардлівым настроям у адносінах да совецкага гандлю, якія праяўляюцца некаторымі элементамі нашай партыі. Ён аказаў неапанімае падтрыманне работнікам гандлю, якія жадаюць паставіць совецкі гандаль па сапраўднаму.

Яшчэ ў 1931 г. т. **Сталін, жадаючы ліквідаваць мапапольнае становішча спажыўкааперацыі, прапанаваў Наркамснабу разгарнуць шырэй сетку сваіх магазінаў. Наркамснаб узяўся за выкананне гэтай партыйнай дырэктывы і мы цяпер маем у сістэме Наркамснаба 21.362 крамы, замест 11.209 крам, якія былі ў 1930 г.**

У 1932 г. т. Сталін, турбуючыся аб паляпшэнні работы сталовых, маючы на ўвазе іх значэнне для снабжэння рабочых, прапанаваў перадаць Наркамснабу, аднаўчы ад кааперацыі ў Маскве, Ленінградзе, Данбасе і Урале ўсе сталовыя, паставіўшы перад Наркамснабам запачу разгарнуць іх сетку і палепшыць дакасць работы.

У гэтых сталовых мы кормім цяпер у Маскве 2.340 тыс. чалавек, і штодзень маскоўскія школьнікі атрымліваюць з іх гарачыя абеды і снеданні па 430 тыс. чалавек.

Якасць работы сталовых стала цяпер значна лепшай. Я, напрыклад, будучы у Данбасе бачыў многа вельмі добрых сталовых для шахцёраў (голас:—«Зараз яшчэ лепш працуюць»).

— Але я павінен сказаць, што самае небяспечнае, — гэта зазнаваецца. Многа ў нас і дрэнных сталовых, якія трэба палепшыць. Даць дрэнны абед — гэта горш чым спшыць дрэнны касцюм ці зрабіць дрэнный бацінкі. Дрэнны абед шкодзіць здароўю рабочага, а часам і атручвае абедаючых. Выпадкі атручвання ў нас яшчэ маюць месца. Вось чаму на нас кладзецца велізарная адказнасць за работу кожнай сталовай. Пры дапамозе ўсіх партыйных арганізацый мы паляпшаем захоўванне прадуктаў у сталовых, будуем ледоўні, малепькія і вялікія, каб у кожнай сталовай, у кожным буфеце была халадзільная альбо проста ледоўня.

У гэтым годзе павінна быць зататоўлена за зіму да 4 млн. цэнтнераў толькі для сталовых.

Мы стараемся рабіць так, каб нашы рабочыя атрымлівалі такія-ж добрыя прадукты, якія мы вывозім. Ужо зараз мы даем частку тавараў найлепшай якасці, а ў далейшым, пры дапамозе партыі, будзем даваць яшчэ больш. (Апладысменты). Мы прыкручылі дырэктараў фабрык вырабляць тавары для нашых рабочых такой-жа якасці, як і тавары экспартныя.

Таварышы, у нас раней амаль не было харчовай прамысловасці. Цяпер яна ў нас ёсць і ўзброена навейшай тэхнікай. Ужо зараз па будавана не мала, а ў другой пяцігодцы павінна быць пабудавана яшчэ больш мясакамбінатаў, цукровых заводаў, кансервовых заводаў, кандзіцерскіх фабрык, заводаў фруктовых вод, заводаў па вырабу мыла і пераапрацоўцы малака і т. д. і т. п.

Пры абмеркаванні плана другой пяцігодкі вы ўбачыце, якія аграмадныя патрабаванні ставяцца перад харчовай прамысловасцю па павялічэнню вытворчасці яе прадукцыі. Снежаньскі зварот ЦК да ўсіх партарганізацый аб паляпшэнні якасці прадуктаў харчовай прамысловасці, аб санітарыі і гігіены харчовых прадпрыемстваў, прад'явіў харчовай прамысловасці і павышэнню якасныя патрабаванні.

Разглядаючы работу рыбалоўных басейнаў краіны, мы павінны пахваліцца вялікімі поспехамі ў здабычы рыбы на Мурманску, а за апошні час і якасцю яе апрацоўкі. За перыяд з 1929 па 1933 г. здабыча рыбы ў Мурманску вырасла ў тры разы. У 1929 г. было здабыта 424 тыс. цэнтнераў, а ў 1933 г. — 1361 тыс. цэнт. На поўначы, у Мурманску, працуюць у нас 65 рыбалоўных траўлераў, якія круглы год у любы вецер і буру знаходзяцца ў акіяне, дзе здабываюць рыбу для снабжэння нашых рабочых.

Калі мы можам пахваліцца работай у Мурманскім і Азова-Чорна морскім басейнах, то мы не можам пахваліцца ёю на Далёкаўсходнім, Астраханскім і Каспійскім басейнах, дзе здабыча рыбы ідзе яшчэ дрэнна. Галоўная прычына заключаецца ў канцылярска-бюракратычным метадзе работы рыбных арганізацый гэтых басейнаў. На Каспіі і на Далёкім Усходзе мы павінны перабудаваць усю сістэму работы рыбных арганізацый, каб выканаць праграму бягучага году і другую пяцігодку па здабычы рыбы.

Гаворачы аб мясной прамысловасці, я звяртаю вашу ўвагу больш за ўсё на свінню. Гэта благародная жывёла, якая можа аказаць нам самую хуткую дапамогу ў вырашэнні сыравой базы нашых мясакамбінатаў.

Паркамснабу ўдалося ў галіне разгортвання свінасоўгасаў у Маскоўскай і Ленінградскай абласцях дабіцца наступных рэзультатаў: замест 51 тыс. галоў свіней у ліпені 1932 г. пры перадачы свінасоўгасаў ад Наркамзема Наркамснабу, мы маем цяпер на 1 студзеня 1934 г., г. зн. праз паўтара года з моманту перадачы—190 тыс. галоў свіней, 51 тыс. галоў з 190 тыс. галоў, праз паўтара года — гэта не дрэнна.

Паркамснаб нядаўна закончыў пабудову першай чаргі новых мясакамбінатаў паводле амерыканскіх праектаў у Маскве, Ленінградзе і Баку. Гэтыя мясакамбінаты нам дадуць добрай якасці мяса, рознастайную добрую каўбасу, выраблены ў належных санітарных умовах, прычым жывёла, папаўшая на мясакамбінат, скары стоўваецца поўнасцю. Як сказаў мне адзін з работнікаў мясной прамысловасці, па мясакамбінаце астаецца пескарыстаным толькі апошняе ўздыханне жывёлы (**смех**).

Такой-жа чыстаты, як на новых мясакамбінатах Масквы і Ленінграда, мы павінны дабіцца на ўсіх прадпрыемствах харчовай прамысловасці. А для таго, каб да сягнуць чыстаты, не абавязкова высокая тэхніка. Тут патрэбна добрае гаспадарскае вока, дысцыпліна, акуратнасць і культурнасць з боку рабочых і служачых. Змагаючыся за паляпшэнне якасці харчовых прадуктаў, мы павінны падняць культурны ўзровень усіх работнікаў, якія абслугоўваюць харчовыя прадпрыемствы, забяспечыць іх асабістую гігіену, правесці моцную дысцыпліну і самы строгі парадак на фабрыках, заводах і ў сталовых.

Мы павінны ўсямерна разгарнуць харчовую прамысловасць, бу даваць новыя прадпрыемствы і паляпшаць работу старых як дробяшчых, так і буйных як агульнасаюзных, так і мясцовых прадпрыемстваў.

Калі лёгкая прамысловасць развіваючыся дасць больш абутку, больш мануфактуры, а мы дамо больш мяса, больш рыбы, больш цукру і тлушчаў — хлебная праблема ўжо вырашана, — мы зможам даць яшчэ больш разбег нашай социялістычнай індустрыі, нашай социялістычнай будоўлі, бо, паляпшаючы быт рабочага класа, мы падымаем вышэй прадукцыйнасць працы і забяспечваем новыя тэмпы работы.

***

Таварышы! Мы не змаглі-б на XVII з'ездзе таржэствавать нашы найвялікшыя перамогі, калі-б тав. Сталін так бліскуча не павёў наперад справы, астаўленай **Леніным**. Тав. Сталін высока падняў тэарытычны сцяг Леніна і вядзе нашу партыю так, як вёў яе Ленін.

У самыя цяжкія моманты нашай барацьбы, калі ў многіх апускаліся рукі і дрыжэлі ногі перад сілай ворага, тав. **Сталін** заўсёды бясстрашна ішоў наперадзе і вёў за сабой партыю. У моманты небяспекі ён заўсёды спакоен і ўпэўнен, бо ён ясна бачыць шлях нашых перамог. Калі ў восень 1930 года жалкія асколкі апазіцыйных груповак, сярод іх Зіноўеў, Каменеў і Руцыны усіх масцей, падняслі галовы, лічачы, што з калектывізацыяй у нас не выходзіць — «ах, у іх правал, калгасы праваліліся, соўгасы праваліліся, сабатаж, голад»—калі некаторыя адарваныя ад жыцця комуністы ва ўстановах шушукаліся па кутках, тады тав. **Сталін** сваёй геніяльнай празарлівасцю і сталёвай цвёрдасцю падняў дух і волю нашай партыі і ўсіх працоўных па барацьбу і за некалькі месяцаў забяспечыў нашай партыі найвялікшую перамогу па калгасна-соўгасных палях, бо ён — вялікі палкаводзец вялікай партыі, вялікай краіны (**бурныя апладысменты**).

Усе дзесяцігоддзі без Леніна паказалі, што Сталін вядзе нашу партыю ў баях і аберагае адзінства партыі лепш, чым хто. І надалей тав. **Сталін** здолее ўберагчы адзінства партыі, згуртаваць вакол яе ўвесь рабочы клас і калгаснае сялянства, і пад яго геніяльным кіраўніцтвам партыя згуртаванымі радамі пойдзе на штурм новых пазіцый, да поўнага завяршэння пабудовы будынка социялізма наперакор ворагам (**бурныя доўгія апладысменты**).

ДЗЕННІК ВЯЧЭРНЯГА ПАСЯДЖЭННЯ 1-га ЛЮТАГА

Адкрыўшы вячэрняе пасяджэнне з'езда, тав. ШКІРАТАЎ прадастаўляе слова для працягу справаздачнага даклада Цэнтральнай Кантрольнай Камісіі тав. Я. Э. РУДЗУТАКУ, якога з'езд сустракае доўгімі апладысментамі.

Тав. Рудзутак, заканчваючы раздзел даклада аб транспарце, гаворыць, што ў нашага транспарта ёсць усё неабходнае, каб ён працаваў так, як гэтага патрабуе ленінскі Цэнтральны Камітэт. Недахопы тэхнічнай і матэрыяльнай базы на шага транспарта не з'яўляюцца непераможнай перашкодай для таго, каб наш транспарт працаваў па большэвіцку. Асноўнае, — гаворыць тав. Рудзутак, — заключэцца ў арганізацыі работы. Я ўпэўнен, што XVII з'езд партыі дасць моцны штуршок таму, каб наш транспарт перастаў быць адстаючым участкам, які лімітуе агульны пад'ём усёй нашай социялістычнай гаспадаркі.

Пасля гэтага тав. Рудзутак пераходзіць да наступнага раздзела свайго даклада — да чысткі партыі, які выслухоўваецца з'ездам з выключнай увагай.

Тав. Рудзутак падкрэслівае, што чыстка выклікала вялікі ўздым ак тыўнасці не толькі партыйных арганізацый, але і шырокіх беспартыйных мас. Чыстка выклікала велізарны вытворчы энтузіязм сярод найшырэйшых мас рабочага класа і калгаснага сялянства.

Чыстка вызваліла партыю ад апартуністаў, двурушнікаў, чужых і прымазаўшыхся людзей, недыцыплінаваных, — усіх тармазіўшых социялістычнае будаўніцтва элементаў. Чыстка ўсюды мела сваім рэзультатам павышэнне ідэйна-палітычнага ўзроўню партыйных арганізацый і ўмацавала сувязь партыі з масамі.

На 1 студзеня 1934 г. праверана 1.149.850 членаў і кандыдатаў партыі. З гэтай колькасці выключана 17 проц., пераведзена ў кандыдаты і спачуваючыя 6 проц. Па социяльнаму складу найбольшы процант выключаных падае на сялян —23 проц. Па партыйнаму стажу асноўная частка выключаных падае на ўступіўшых у нашу партыю за апошнія тры-чатыры гады.

Найбольш палітычна-выхаванымі і дысцыплінаванымі арганізацыямі аказаліся ваенныя арганізацыі (АПЛАДЫСМЕНТЫ), па якіх выключана 2,7 проц., пераведзена ў кандыдаты — 2.6 проц. і ў спачуваючыя — 0,4 проц. Мы маем, — гаворыць тав. Рудзутак, — такія арганізацыі, як партыйная арганізацыя Балтыцкага флота, у якой 72 ячэйкі прайшлі без адзінага паражэння, г. зн. не было ні аднаго выключанага, ні аднаго пераведзенага ў кандыдаты і спачуваючыя (АПЛАДЫСМЕНТЫ).

Чыстка партыі выявіла рад хібаў у рабоце і жыцці партыйных арганізацый. Пасля чысткі партыйныя арганізацыі сталі працаваць значна лепш. Задача зараз заключаецца ў тым, каб замацаваць рэзультаты праведзенай чысткі, яшчэ з большай энергіяй павесці социялістычнае наступленне супроць апошніх астаткаў капіталістычных элементаў, з яшчэ большай сілай весці барацьбу за пабудову бяскласавага социялістычнага грамадства.

У заключнай частцы даклада тав. РУДЗУТАК абгрунтоўвае неабходнасць рэарганізацыі ЦКК-РСІ ў камісію партыйнага і совецкага кантролю. ЦКК змагалася ў першых радах барацьбітоў за социялізм. Яна з гонарам выканала свае задачы.

Цяпер змянілася абстаноўка, змянілася ўмовы і метады работы, і ў адпаведнасці з гэтым мы павінны перабудаваць нашы кантрольныя органы — партыйныя і совецкія.

Пад бурныя доўгія апладысменты тав. Рудзутак заканчвае свой даклад выражэннем непахісной упэўненасці, што пад кіраўніцтвам тав. СТАЛІНА, свайго любімага правадыра, пад сцягам Маркса-Леніна-Сталіна пролетарыят, сёння ўжо пе рамогшы на адной шостай частцы земнага шара, атрымае заўтра перамогу ў сусветным маштабе.

Адкрываюцца спрэчкі па дакладу тав. Рудзутака. Першай выступае спатканая доўгімі апладысментамі тав. М. І. УЛЬЯНАВА. Марыя Ільінічна заяўляе ў пачатку сваёй прамовы, што нашымі бліскучымі перамогамі мы абавязаны ў першую чаргу таму, што 10 год нас вядзе па ленінскаму шляху лепшы саратнік ІЛЬІЧА, верны прадаўжальнік яго справы — тав. СТАЛІН.

М. І. Ульянава ўказвае на тое, што большэвікам не ўласціва зазнавацца, захапляцца поспехамі. У нас яшчэ многа недахопаў, і для таго, каб паспяхова з імі змагацца, мы павінны перабудаваць органы партыйнага і совецкага кантролю так, як гэта намечана ў тэзісах тав. Кагановіча. З'езд адчувае доўгімі апладысментамі на апошнія словы прамовы Марыі Ільінічны, у якіх яна гаворыць, што пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК, пад кіраўніцтвам выдатнага арганізатара мільёнаў тав. Сталіна паотыя ўпэўнена пойдзе да новых баёў і новых перамог.

Другім па справаздачнаму дакладу Цэнтральнай Кантрольнай Камісіі выступае тав. БАЙЧУРЫН (Татарыя).

Генеральная лінія партыі, ленінска-сталінская нацыянальная палітыка знаходзіць яркае выражэнне ў развіцці ўсіх нацыянальных рэспублік і абласцей, у прыватнасці Татарыі. Татарская рэспубліка за першую пяцігодку змяніла свой твар: умацавалася індустрыя, удзельная вага прамысловай прадукцыі ў народнай гаспадарцы Татарыі з 30 проц. у 1929 г. выраслa да 66 проц., а разам з прадукцыяй промкааперацыі да 70 проц. Гэты социялістычны рост рэспублікі на ўхільна прадаўжаецца. Капітальныя ўкладанні ў прамысловасць і транспарт у бягучым годзе складаюць 16 млн. руб. Растуць нацыянальныя татарскія кадры. Сярод рабочых звыш 40 проц. татараў.

Но менш сур'ёзныя поспехі дасягнуты ў сельскай гаспадарцы. Гэта рэзультат вялікай барацьбы ўсёй партыйнай арганізацыі за ажыццяўленне ўказанняў тав. Сталіна аб рабоце на вёсцы. Ураджайнасць павысілася на 22 проц. Датэрмінова завершаны зернапастаўкі. Насенфонды засыпаны. Змагаючыся з астаткамі кпасавага ворага, з ухілам у нацыянальным пытанні, рэспубліка будуе социялістычную культуру.

Спыняючыся на задачах партыйнага і совецкага кантролю, тав. Байчурын гаворыць, што намячаемыя ў гэтым напрамку мерапрыемствы партыі яшчэ больш умацуюць дыктатуру пролетарыята, узмоцняць барацьбу за выкананне задач другой пяцігодкі.

Апладысментамі сустракае з'езд тав. Е. М. ЯРАСЛАЎСКАГА.

— На гэтым з'ездзе кожны з нас асабліва моцна адчувае блізасць да канчатковай перамогі комунізма. Азіраючыся на пройдзены партыяй 30-гадовы шлях, кожны з нас адчувае глыбокую радасць, кожны са знае, што перамогі дасягнуты таму, што мы няўхільна ішлі па шляху, указанаму ЛЕНІНЫМ, пад кіраўніцтвам геніяльнага правадыра тав. СТАЛІНА (АПЛАДЫСМЕНТЫ).

Нашы перамогі дасягнуты таму, што партыя захавала адзінства сваіх радоў, разграміла ўсіх апартуністаў, вяла і вядзе з імі непрымірымую барацьбу. З'езд дасць праграму грандыёзных работ. Гэта праграма выцякае з ленінскага плана пабудовы социялістычнага грамадства, яе паспяхова і мудра ажыццяўляе тав. СТАЛІН.

Тав. Яраслаўскі гаворыць аб той барацьбе, якая праводзілася супроць трацкістаў, правых ухілістаў, прымірэнцаў і ўсякіх антыпартыйных групіровак.

Затым тав. Яраслаўскі спыняецца на пытаннях арганізацыі партыйнага і совецкага кантролю, на выніках чысткі ў 10 краях і абласцях СССР.

Ён адзначае, як адно з найбольшых дасягненняў чысткі — ПАВЫШЭННЕ ЎДЗЕЛЬНАЙ ВАГІ РАБОЧЫХ, напрыклад, у Кіеўскай вобласці процант рабочых у складзе партыйнай арганізацыі павысіўся з 60 да 63, у Адэскай — з 60 да 67, ва Усходняй Сібіры з 46 да 52, у Далёкаўсходнім краі — з 58 да 62 проц.

Чыстка павысіла пачуццё адказнасці партыйцаў за даручаную ім справу, паставіла перад усімі партыйнымі арганізацыямі задачу паляпшэння партыйнавыхаваўчай работы.

Тав. Яраслаўскі ўказвае, што зарука нашых поспехаў ў другой пяцігодцы — любоў і адданасць Леніну, небывалае згуртаванне радоў партыі вакол увасабляючага ў сабе сілу, волю, мысці і энергію нашай партыі тав. СТАЛІНА, вакол Цэнтральнага Камітэта.

ТАВ. СУХАМЛІН (УССР) асноўную ўвагу ў сваім выступленні аддаў пытанню аб велізарных нескарыстаных рэзервах, якія ёсць у прамысловасці, транспарце і ва ўсіх іншых галінах гаспадаркі СССР. Ён ілюстраваў гэта цэлым радам прыкладаў. Напрыклад, з 1932 да 1933 года Украіна павялічыла аб'ём доменных печаў на 30 проц., а выплаўка чыгуна вырасла толькі на 12,6 проц. Зараз у Данбасе скапіла ся 60 тыс. вагонаў невывезенага вугалю, на заводах сталі да 30 тыс. вагонаў метала, бо транспарт скары стоўваецца нерацыянальна.

Абследаванне чыгунак Украіны паказала, што вагоны звычайна знаходзяцца ў руху толькі 5 гадзін, а астатнія 19 гадзін стаяць пад выгрузкай і на іншых прычынах.

Тав. Сухамлін указвае на наспеўшую неабходнасць рашучай перабудовы метадаў работы кантрольных органаў. Прапануемая ў тэзісах тав. Кагановіча з'езду рэарганізацыя ЦКК і стварэнне камісій партыйнага і совецкага кантролю зусім правільна і неабходна.

Выступленнем тав. Сухамліна закончыліся спрэчкі па дакладу тав. Рудзутака.

Тав. Петэрс ад імя маскоўскай, ленінградскай і украінскай дэлегацыі прапануе прыняць наступную рэзалюцыю:

Заслухаўшы справаздачны даклад тав. РУДЗУТАКА, XVII з'езд ВКП(б) цалкам адабрае дзейнасць ЦКК-РСІ.

Пад дружныя апладысменты дэлегатаў РЭЗАЛЮЦЫЯ ПРЫМАЕЦЦА АДНАГАЛОСНА.

Затым тав. ЕЖАЎ, спатканы апладысментамі, выступае з дакладам мандатнай камісіі. На XVII з'ездзе прысутнічаюць 1.225 дэлегатаў з рашаючым голасам і 736 дэлегатаў — з дарадчым голасам.

Сярод дэлегатаў з рашаючым голасам 598 чалавек — 48,5 проц. упершыню з'яўляюцца дэлегатамі з'езда. Гэта паказвае, што за справаздачны перыяд выраслі новыя пласты кіруючых партыйных работнікаў.

80 проц. дэлегатаў з'езда з рашаючым голасам уступілі ў партыю ў гады подполля і ў часы грамадзянскай вайны — да 1920 г. Падпольшчыкаў сярод дэлегатаў — 22,6 проц., 75 проц. дэлегатаў прымалі ўдзел у грамадзянскай вайне.

Рэзка павялічылася ў параўнанні з XVI з'ездам колькасць дэлегатаў — работнікаў сельскай гаспадаркі і транспарта. Сярод дэлегатаў 168 работнікаў палітаддзелаў МТС, соўгасаў і чыгуначных дарог.

З'езд АДНАГАЛОСНА ЗАЦВЕРДЗІЎ даклад мандатнай камісіі. Гэтым закончылася вячэрняе пасяджэнне з'езда 1 лютага.

„З капіталістычнымі элементамі ў прамысловасці ўжо пакончана, а соцыялістычная сістэма гаспадаркі з'яўляецца зараз адзінай, манапольнай сістэмай нашай прамысловасці"

(СТАЛІН)

ПОЎНАСЦЮ АЖЫЦЦЯВІЦЬ УКАЗАННІ ПРАВАДЫРА

Даклад дэлегата XVII з'езда тав. Чарнышова на злёце ударнікаў Бярэзінскага камбіната

БАРЫСАЎ, 2. (Па тэлефону ад наш. кар.).

Учора ў клубе хімікаў адбыўся злёт ударнікаў Бярэзінскага камбіната. 600 рабочых, работніц і ІТР з'явіліся па злёт для таго, каб яшчэ раз праслухаць, што сказаў на XVII з'ездзе партыі любімейшы правадыр тав. **Сталін** і падвесці вынікі барацьбы за пром фінплан, выканання самаабавязацельстваў, узятых перад XVII з'ездам ВКП(б) і намеціць канкрэтныя задачы далейшай барацьбы за ажыццяўленне указанняў тав. **Сталіна.**

Папярэдні даклад аб рабоце XVII з'езда ВКП(б) зрабіў дэлегат з'езда —сакратар райкома тав. **Чарнышоў.**

Тав. Чарнышоў падрабязна спыняецца на рабоце з'езда, перадае змест даклада тав. Сталіна, выступленні асобных дэлегатаў.

Кожны з прысутных з вялікай увагай слухае прадстаўніка з'езда. Кожнае слова геніяльнейшага правадыра партыі і сусветнага пролетарыята тав. **Сталіна,** перададнае тав. Чарнышовым, выклікае гром апладысментаў, новы ўздым энтузіязма і энергіі, умацоўвае непахісную волю ў кожнага ўдзельніка злёта аддана змагацца за далейшыя перамогі соцыялізма, за Окцябр ва ўсім свеце.

— У сваім дакладзе тав. **Сталін** сказаў,—гаворыць тав. Чарнышоў, — што хто напрабуе напасці на Совецкі Саюз, ён атрымае поўны разгром працаўніка на фронце і пролетарскую рэволюцыю ў тылу працаўніка.

Зала ўзрываецца бурай апладысментаў: «Няхай жыве тав. Сталін», «Няхай жыве слаўная Чырвоная армія», «Няхай жыве ВКП(б)», «Няхай жыве Окцябрская рэволюцыя ва ўсім свеце». Апладысменты заціхаюць і з яшчэ большай сілай узрываюцца пасля слоў т. Чарнышова аб тым, што XVII з'езд пастанавіў:

— «Ухваліць цалкам і поўнасцю палітычную лінію і практычную работу ЦК ВКП(б).

— Ухваліць справаздачны даклад тав. **Сталіна** і прапанаваць усім партарганізацыям кіравацца ў сваёй рабоце палажэннямі і задачамі, высунутымі ў дакладзе тав. Сталіна».

Злёт паслаў тав. **Сталіну** прывітальную тэлеграму.

Злёт заслухаў даклад дырэктара фабрыкі аб задачах выканання промфінплана 1934 года і ўключыўся ва ўсебеларускую нараклічку па выкананню плана другога года 2-й пяцігодкі.

За ўдарную работу па выкананню плана (студзеньскі промфінплан камбінатам выкананы на 102 проц.) на злёце былі прэміяваны 250 лепшых ударнікаў.

Выступаўшыя ўдарнікі, дзелячыся вопытам сваёй работы, бралі на сябе канкрэтныя самаабавязацельствы па выкананню плана, паляпшэнню якасці прадукцыі. З якасцю прадукцыі справа на камбінаце абстаіць дрэнна.

Уключыўшыся ва ўсебеларускую нараклічку, калектыў камбіната павінен пабольшэвіцку выканаць узятыя на сябе самаабавязацельствы, поўнасцю ажыццявіць указанні тав. **Сталіна** і рашэнні XVII з'езда партыі ў сваёй штодзённай рабоце.

Рабцэвіч.

Выкананнем самаабавязацельстваў рапартуюць з'езду і тав. Сталіну

ГОМЕЛЬ, 1. (Па тэлефону ад нашага карэспан.).

На фабрыках і заводах ужо чацверты дзень праходзяць мітынгі і сходы, прысвечаныя XVII з'езду ВКП(б) і прапрацоўцы даклада тав. **Сталіна.** Рабочыя гомельскіх прадпрыемстваў рапартуюць правадыру партыі выкананнем самаабавязацельстваў, узятых па сябе ў сувязі з падрыхтоўкай да з'езда.

Прапрацоўка даклада тав. Сталіна на швэйнай фабрыцы **«Комінтэрн»** праходзіць пад лозунгам ліквідацыі прарыву па выкананню промфінплана, паляпшэнню якасці выпускаемай прадукцыі і асваенню новых асартыментаў. Цэх галіфе датэрмінова выканаў студзеньскую праграму. Выканаў па 104 проц. студзеньскі промфінплан і пінжачны цэх фабрыкі. Цэх бялізны асвоіў выпуск раду новых асартыментаў.

Ударнікі **суднарамонтных майстэрань** адказалі на даклад тав. **Сталіна** выкананнем сваіх перадз'ездаўскіх абавязацельстваў, датэрміновым сканчэннем студзеньскай праграмы, новымі перамогамі ў авалодванні тэхнікай. Паасобныя параходныя каманды змагаючыся за права рапарта з'езду дабіліся значных поспехаў у аздараўленні рачнога флота. Каманда па рахода **«Сцяпан Разін»** зрабіла рамонт ужо на 78 проц. Ударныя брыгады цепаравога флота адрамантавалі свае адзінкі на 67 проц. Адзін з лепшых рацыяналізатараў гомельскай прыстані—плесавы механік Грыцэнка прапанаваў новае прыстасаванне для заліўкі падшыпнікаў.

Воднікі абавязуюцца сустрэць навігацыю 1934 года ў поўнай баявой гатоўнасці.

З вялікім энтузіязмам сустрэлі даклад тав. Сталіна рабочыя фабрыкі **«Праца».** Яны абавязаліся змагацца за перавыкананне промфінплана, павысіць якасць прадукцыі, скончыць давядзенне промфінплана да цэхаў і брыгад, перавесці на здзельную аплату 90 проц. рабочых.

ГАСМАН.

Адказ трыкатажнікаў на даклад тав. Сталіна

На мітынг, прысвечаны XVII з'езду ВКП(б) і дакладу тав. **Сталіна** сабраліся цэлае імены рабочых і работніц менскай панчошна-трыкатажнай прамарцелі імя **Крупскай** у ліку 350 чалавек.

Паведамленне аб дакладзе тав. **Сталіна** выслухоўваецца з вялікай увагай. Імя тав. Сталіна і вытрымкі з даклада аб задачах па вырабу тавараў шырэйшаму трыкатажнікі сустракаюць громам апладысментаў.

З'езду партыі і тав. Сталіну трыкатажнікі рапартуюць аб датэрміновым выкананні студзеньскага промфінплана на 100,3 проц. (задание 364 тыс. руб.). Брак за гэты час зніжан з **3** да **0,5** процантаў.

Ахопленыя энтузіязмам, з новым прыліўам бадзёрасці трыкатажнікі абавязаліся **поўнасцю рэалізаваць пастаўленыя тав. Сталіным задачы аб павялічэнні выпуску высокаякасных тавараў шырэйшага ўжытку.** Уключыўшыся ва ўсебеларускую нараклічку па выкананню плана другога года другой пяцігодкі, арцель імя Крупскай выклікала на соцспаборніцтва па лепшаму выкананню ўзятых самаабавязацельстваў арцелі швэйнікаў **«Пролетарый»** і **«Новы шлях».**

У гутарцы работніцы матальнага цэха ўспаміналі, як яны 7-10 гадоў таму назад не мелі ніякай кваліфікацыі. Частка з іх былі хатнімі гаспадынямі, хатнімі работніцамі, а частка—беспрацоўнымі. Цяпер гэта — толькі ўспаміны.

Касальман Сора — былая хатняя работніца, расказвае, што яна ў 1927 годзе паступіла ў арцель, не маючы ніякай кваліфікацыі.

— Працавала я ля машыны да канца 1931 года, — гаворыць яна, — і як лепшую ўдарніцу мяне высунулі загадчыкам цэха. Наш цэх заўсёды ідзе перадавым, я з'лучыўся героям першай пяцігодкі.

У канцы 1933 года жакт № 41 прадаставіў мне светлы і ўтульны пакой, аб якім мой бацька ў час праклятага царызма, прапушчы па вёсцы шаўком, і марыць не мог. Зарабляю я 200 руб. у месяц, жыву добра і з радасцю працую. Ды ці адна я такая! Пашы пяцігадзінныя ўдарніцы амаль усе прайшлі такі шлях.

Мы змагаемся з будзем яшчэ з большай сілай змагацца за ажыццяўленне ўказанняў нашай партыі і нашага любімага правадыра і настаўніка тав. **Сталіна.** Мы змагаемся не толькі за промфінплан, але і за ўмацаванне абароназдольнасці нашай краіны. Я хутка атрымаю годнасць варашылаўскага стралка, змагу метка страляць па свіных рылах, калі яны адважацца сунуцца ў наш совецкі агарод.

А. М.

МЫ ЗАВАЯВАЛІ ПРАВА НАСІЦЬ ГАНАРОВАЕ ІМЯ

ВІЦЕБСК, 1. (Па тэлефону ад наш. кар.).

Прапанова ўдарнікаў перапрыбых фабрык і заводаў Гомеля аб арганізацыі ўсебеларускай нараклічкі па выкананню плана другога года 2-й пяцігодкі — кантроўны ўклад у справу далейшага разгортвання соцыялістычнага будаўніцтва ў БССР.

Наша брыгада, якая носіць імя вялікага правадыра і настаўніка сусветнага пролетарыята — тав. **Сталіна,** прачытаўшы ў «Звяздзе» зварот гомельскіх ударнікаў, уключылася ў нараклічку. У сувязі з гэтым мы хочам падзяліцца вопытам нашай работы ў барацьбе за выкананне вытворчых заданняў.

Брыгада наша нецарма носіць імя тав. **Сталіна** — вялікага прадаўжальніка справы Маркса-Леніна. Мы заваявалі права на гэта ў штодзённай упартай і настойлівай працы, у штодзённай барацьбе за промфінплан.

Наша ўдарная работа ў лютым 21 студзеня мы рапартавалі аб стопроцантным выкананні студзеньскай вытворчай праграмы. Да канца студзеня мы ўнеслі звыш плана ў соцыялістычны фонд імя тав. Сталіна звыш тысячы польтаў. Уся студзеньская праграма тэхпім выканана на 134 проц.

Якасць нашай работы заўсёды сумяшчалася з тэмпамі. З бракам мы пакончылі канчаткова, перабоўкі давялі да 0,24 проц.

Аднак, дасягнутымі поспехамі мы не абмяжоўваемся. Уключыўшыся ва ўсебеларускую нараклічку мы бяром на сябе абавязацельства выканаць лютаўскую праграму не пазней 26 лютага, асвоіць новы асартымент — асенняя польты «рэглан», павялічыць штодзённы выпуск прадукцыі з 118 да 128 адзінак, выпускаць выключна добраякасную прадукцыю, унікаючы не толькі браку, але і перабоўкі.

Таксама абавязваемся ў лютым ахапіць здачай соцтэхзаказона на значок «ЗОТ» усю брыгаду ў складзе 33 чал., бераючы свае мацныя, як зяніцу вока і трымаць ва ўзорным парадку сваё рабочае месца.

Бяром на буксір брыгаду першай лепты — Ленінай, каб дапамагчы ёй ліквідаваць прарыў і быць зняцай з чорнай дошкі, для чаго выдзяляем спецыяльна трох лепшых работніц для штодзённай перадачы вопыту сваёй работы і канкрэтнай, жывой дапамогі.

У мэтах яшчэ большага ўмацавання абароназдольнасці нашай краіны мы абавязваемся ўсёй брыгадай у лютым і сакавіку здаць норму на варашылаўскі значок.

Выконваючы ўказанне тав. Сталіна «быць вернымі да канца справе пролетарскага інтэрнацыяналізма, справе брацкага саюзу пролетарыяў усіх краін», мы абавязваемся і надалей умацоўваць нашу міжнародную пролетарскую салідарнасць, актыўна прапаваць у арганізацыі МОПР'а, сістэматычна аказваць палітвазнам капітала матэрыяльную і матэрыяльную дапамогу.

Вяртаючы на сябе гэтыя абавязкі, мы выклікаем паслядніцкі нашаму прыкладу перадавыя брыгады швэйнай прамысловасці БССР, у прыватнасці фабрык **«Профінтэрн»** (Віцебск) і **«Окцябр»** (Менск).

Па даручэнню брыгады імя тав. Сталіна цэха польтаў, фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі»:

Брыгадзір Мельнікова, інструктар **Барэнбаум,** ударніцы **Коннікава, Сцепаненка, Ліхашоўская, Раманава, Сінякова, Фадзеева.**

Прапрацоўка даклада тав. СТАЛІНА ячэйкай ліцейнага цэха завода «КОМУНАР» сумесна з беспартыйнай моладдзю. Прапрацоўку даклада вядзе прымацаваны член партыі тав. ДУНЕР—работніца мадэльшчыца гэтага-ж цэха.

Фота І. М. КАПЛІНСКАГА.

Указанне любімага правадыра будзе выканана

У клубе імя Варашылава на сходзе рабочых прамысловых арцеляй «Чырвоны Кастрычнік», «Іскра», «Чырвоны інвалід», «Другая пяцігодка» і «Чырвоны трыкатажнік» адбылася масавая прапрацоўка даклада тав Сталіна на XVII партыйным з'ездзе.

З напружанай увагай выслухалі рабочыя паведамленне аб гістарычным дакладзе любімага правадыра сусветнага пролетарыята тав. Сталіна.

У гонар гістарычнага XVII з'езда слесарная арцель **«Чырвоны інвалід»** к 29 студзеня выканала студзеньскую вытворчую праграму па 101,1 проц. Лепшы ўдарнік арцелі тав. **Манькоўскі** выканаў свой план на 147 проц., **Вайніловіч—138, Башко—107** і т. д.

Брыгада заказнага цэха шавецкай арцелі «Чырвоны Кастрычнік» студзеньскі план выканала на 110 проц. Лепшы ўдарнік тав. **Герчык** выканаў план на **140** проц., **Малкоўскі—130, Каплінскі—130** і т. д.

— Мы заўважым тав. Сталіну, — гаварылі выступаўшыя ўдарнікі, — што яго ўказанне аб павялічэнні выпуску шырэйшаму будзе намі выканана. У нас ёсць вялікія магчымасці для паляпшэння вырабу таварам шырэйшаму і мы іх поўнасцю скарыстаем, каб забяспечыць усю масу спажыўцоў неабходнымі таварамі.

Сход абгаварыў лист ударнікаў перадавых фабрык і заводаў Гомеля на ўсіх рабочых, работніц і ІТР Совецкай Беларусі і пастанавіў уключыцца ва ўсебеларускую нараклічку па выкананню плана другога года другой пяцігодкі.

АФАНАСЕНКА.

7-га ЛЮТАГА ЎСЕБЕЛАРУСКАЯ РАДЫЁНАРАДА ПАРТОРГАЎ І ГРУППАРТАГІТАТАРАЎ

Аб вопыце папулярызацыі рашэнняў XV з'езда КП(б)Б і XVII з'езда ВКП(б)

На нарадзе выступаюць:

АД МЕНСКА — группартагітатар завода імя Варашылава і парторг абутковай фабрыкі імя Кагановіча.
АД ВІЦЕБСКА — парторг завода «Чырвоны металіст» і группартарганізатар швэйнай фабрыкі «Профінтэрн».
АД ГОМЕЛЯ — группартарганізатар завода імя Ланцуцкага.
АД МАГІЛЕВА — парторг шаўковай фабрыкі імя Куйбышэва
АД БАРЫСАВА — парторг завода «Комунар».

Радыёнарада адбудзецца 7 лютага з 19 гадзін 30 мінут да 21 гадзіны 20 мін.

РЭДАКЦЫЯ «ЗВЯЗДЫ».
КАМІТЭТ РАДЫЁВЯЩЧАННЯ.

РАМОНТ ТРАКТАРОЎ

БЕЛСЕЛЬСНАБРАМОНТ І БЕЛМЕТАЛАТРЭСТ ЗРЫВАЮЦЬ РАМОНТ ТРАКТАРОЎ

Чаму завод „Пролетарый" спыніў выпуск запчастак

ГОМЕЛЬ. (Ад нашага спец. кар.).

У самыя гарачыя дні рамонта трактароў гомельскі завод «Пролетарый» вось ужо пяць дзён як спыніў выпуск запасных частак да трактароў з прычыны адсутнасці высокаякаснай бронзы.

Прычыны зрыву гэтага баявога ўрадавага задання крыюцца ў той надзвычайнай блытаніне і неразбярысе, якую стварыў Белсельснабрамонт, пры маўклівай згодзе Белметалатрэста.

Справа, аказваецца, у тым, што па генеральнаму дагавору паміж гэтымі цэнтральнымі арганізацыямі завод «Пролетарый» ча мусці павінен быў расцягнуць тэрміны вырабу запасных частак, патрэбных для рамонта трактароў, на ўвесь год. Замест таго каб выканаць заказ на запасныя часткі для трактароў у максімальна кароткі тэрмін, завод быў пастаўлен у такія ўмовы, што яму прыходзілася штомесячна невялікімі порцыямі праводзіць гэту работу. Зараз дырэкцыя завода адкінула гэты яўна галавацянскі план, узяўшыся выканаць яго на працягу першага квартала бягучага года. Аднак, перабудаваўшы аператыўны план цэхаў завод «Пролетарый» паткнуўся на коснасць апарата Белметалатрэста, які ўпарта адмаўляецца забяспечваць выкананне задання бронзай высокай якасці. Вось чаму завод выпускае цяпер запчасткі для ўборачных машын, а тэрміновае задание, маючае першаступовае гаспадарча-палітычнае значэнне для правядзення сяўбы ў БССР, зрываецца. Трэба яшчэ дадаць, што заводакіраўніцтва «Пролетарыя» расходвала значную частку адпушчанай бронзы на другія мэты, што яшчэ больш паглыбіла становішча з выпускам запасных частак для трактароў.

Усё гэта прывяло да зрыву плана выпуска большасці дэталяй.

На недавыкананні плана адбіваецца і тое, што ліцейны цэх завода «Пролетарый» дае велізарны брак дэталяй, які дасягае 30—40 проц.

Белсельснабрамонт да гэтага часу не даў чарцяжоў і ўзораў для вагара муфты, а прысланы нядаўна чарцёж хамута муфты аказаўся настолькі няясным, што яго прыйшлося вярнуць.

Трэба неадкладна ўнесці поўную яснасць ва ўзаемаадносіны паміж заводам «Пролетарый», Белметалатрэстам і Белсельснабрамонтам. Неабходна ліквідаваць бюракратычныя рагаткі, якія сталі перашкодай у барацьбе за забеспячэнне веснавой сяўбы здаровым трактарным паркам.

Брыгада «Звязды» і «Рабочага» — **Каплан, Гарт.**

Лісты з Лепельскай МТМ

МАЙСТЭРНЯ Ў ПРАРЫВЕ

Новы год майстэрня спаткала холадна і абылякава. Паранейшаму ў доўгіх бараках стылі асірацелыя «Фардзон-Пуцілаўцы», «ХТЗ», «Інтэры». Паранейшаму жывая справа прывядзення машын у баявую гатоўнасць падмянялася ні да чаго не абавязваючымі гучнымі рэзалюцыямі пра «тэмпы», пра «неабходнасць узяцца, як належыць» і т. д.

Паводле плана, на 25 студзеня Лепельская МТМ павінна была адаць адрамантаванымі 93 адзінкі. На гэтае чысло было адрамантавана толькі 59, але і з адрамантаваных трактароў 14 прызнаны нягоднымі.

Пры прыёмцы машын у час абкатакі з-за дрэннаякаснага рамонту прыпілося забракаваць 2 маторы **Бягомпьскай МТС** (дрэнны падбор уклад дышаў), 7 маторaў **Чашніцкай МТС** (забракаваны самім механікам) і 4 маторы **Сенненскай МТС** (няправільная рэгулёўка вазораў, клапанаў і матавіка).

У чым-жа прычыны невыканання вытворчай праграмы і дрэннага рамонту?

Перш за ўсё кідаецца ў вочы паўнейшая адсутнасць аператыўнага кіраўніцтва рамонтам з боку дырэкцыі майстэрні. Па думцы дырэкцыі, даводзіць вытворчую праграму да брыгады—справа лішняя...

— Ва ўсіх газетах пісалі, што мы павінны даць да 15 сакавіка 131 трактар,—чаго-ж болей?—кажуць і дырэктар **Ламачынскі** і старшы механік **Рубцоў.**

Брыгады да апошніх дзён не ведалі свайго задання. Паасобныя рабочыя не ведаюць нават свайго дзённага плана выпрацоўкі—і ў выніку ў майстэрні штодня мітусня і рознабой...

Што асабліва характэрна для Лепельскай МТМ—гэта **поўная адсутнасць тэхнічнага кантролю на ўсіх этапах работы па выпуску прадукцыі.** 20 студзеня, напрыклад, быў адрамантован матор, у якім знойдзены зношаныя, старыя «пальцы». За рамонт апладілі, як належыць... А калі задалі пытанне дырэктару, хто-ж рабіў гэтак нядбала, дык той збянтэжана паспяшыў адказаць:

— У нас у той дзень рамантавалі яшчэ 4 трактары, і паколькі разам працавалі—нельга ўстанавіць вінаватага... Не даведаешся...

Так дырэктар Ламачынскі спрыяе абязлічцы. Так расце безадказнасць у МТМ...

Ёсць шмат фактаў абурэчай нядбайнай дзейнасці Лепельскай МТМ на сённешні дзень. Гэта нядбайнасць не выкаранена, не гледзячы на свае часовыя сігналы «Звязды» ў пачатку студзеня. Не ўведзена, скажам, новая тарыфная рэформа на прадпрыемстве. За рамонт трактарных крылляў раней плацілі рабочаму Пітэйгарту 5 руб. 20 к., потым рашылі плаціць 4 р. 29 к. Абедзве «нормы» ўзяты літаральна са столі. Цяпер-жа, няма ведама чаму, вывелі зноў норму па 5 р. 93 к. Нармірэўшчык Собалеў яўна не разбіраецца ў гэтай справе і робіць «паўгад».

Вялікая доля віны за прарыў на Лепельскай МТМ кладзецца на Белсельгасснаб і Снабрамонт. Гэтыя ўстановы абсалютна не цікавяцца забеспячэннем МТМ запаснымі часткамі—поршнямі, размеркавальнымі валікамі, медна-азбестанымі пакладкамі, штурхачамі... А між тым, 15 трактароў зусім лёгка было-б утвесці ў строй, калі-б былі гэтыя запчаткі.

Прарыву ў майстэрні аб'ектыўна спрыяе ЦП саюза рабочых МТС, якое прыслала ў Лепель у МТМ старшынёй рабкома нейкага Кныша, выключанага з партыі, былога гайдамака. Да апошніх дзён ніякая масавая работа ў майстэрні не вялося.

Палітаддзел Лепельскай МТС, разам з упаўнаважаным ЦК КП(б)Б у апошні час ужыў рад мер, каб вывесці майстэрню з прарыву. Разгрузілі інтэрнат рабочых, давялі большменш план рамонту да брыгад, укаранецца тарыфная рэформа паводле новых норм.

Асаблівая ўвага звернута на ўкараненне соцыялістычных метадаў працы. Калі на 15 студзеня ў майстэрні было ўсяго 6 ударнікаў (з 70 рабочых), дык на 25 іх ужо налічваецца звыш 20 чал.

Разам з раённай газетай «Калгасная праўда», газета палітаддзела МТС выпускае на МТМ спецыяльны бюлетэнь, які значна дапамагае ў выкананні вытворчай праграмы, мабілізуючы масы рабочых на хутчэйшую ліквідацыю прарыву.

Аднак, без рашучага пералому ў дзейнасці Белсельгасснаба і Снабрамонта, без большэвіцкай настойлівасці з боку дырэкцыі самой МТМ добрыя пачынанні палітаддзела могуць павіснуць у паветры.

Ю. ЛЯВОННЫ, Ю. БЕЙЛІН.

Запасныя часткі валяюцца у смецці

Смалявіцкая МТС павінна адрамантаваць да веснавой сяўбы 37 трактароў і 37 трактарных плугоў. План рамонта зрываецца. На 29 студзеня адрамантавана ўсяго 9 трактароў, замест 23-х, і 15 плугоў.

Лісталадаўскі і спескаўскі планы былі сарваны. За гэтыя два месяцы майстэрня адрамантавала ўсяго 4 трактары замест 13-ці. Студзень таксама не даў зруху. За 29 дзён адрамантавана ўсяго 5 трактароў.

Дырэктар МТС **ФІЛІН** і дырэктар майстэрні **МАТУСЕВІЧ** прабуюць тлумачыць гэты ганебнейшы прарыў адсутнасцю запасных частак. Аднак, нават пры павярхоўным аналізе становішча майстэрні становішча ясным, што справа не ў гэтым. **Справа ў безадказнасці, агідным расхлябанасці і самацёку, якія пануюць у майстэрні.**

Два тыдні таму назад у Оршу былі пасланы для расточкі калянчатыя валы. Іх ужо даўным даўно можна было атрымаць, але ды рэкцыя не здолела за вакамі нават пасласць чалавека, а абмяжоўваецца перапіскай, пасылае пісьмы, тэлеграмы.

У майстэрні зусім не дбаюць пра якасць рамонта. Усе 9 адрамантаваных трактароў камісія пры прыёмцы забракавала і прышлося накіраваць іх у паўторны рамонт. Некаторыя трактары праходзілі паўторны рамонт па 3 і нават 5 раз. Напрыклад, з-за абязлічкі, якая пануе ў майстэрні і нядбайнасці брыгадзіра **Жыжкі** калянчаты вал прыходзілася разбіраць 5 раз і ніяк не змаглі знайсці дэфекта. Калі-ж праверылі дэтальна, аказалася, што ў калянчатым вале быў пратэй на паўтара міліметра. Выпраўленне гэтага заняло ўсяго некалькі мінут.

Аб выключным галавацяпстве і абязлічцы, якія пануюць у рабоце МТС і МТМ, сведчыць наступны факт. На пачатку месяца работнікі МТС і МТМ ездзілі ў Менск і Оршу і шукалі чарвячных валікаў. Па гэтаму поваду пісалі шмат тэлеграм, пісьмаў. Нарэшце, у апошнія дні знайшлі на складзе самой-жа МТС сярод усякага смецця. Яны аказаліся зусім прыгоднымі.

У дадатак трэба адзначыць, што сярод рабочых не правяцца ніякай масавай работы. Соцыялістычныя дагаворы, заключаныя паміж брыгадамі, старшынёй рабкома **Татарэвым,** пакінуты ў пазку. Ніхто не пацікавіцца праверыць, як яны выконваюцца.

Так, замест сапраўднай большэвіцкай барацьбы за здаровы трактар, дырэкцыя МТС і МТМ, партячэйка і рабком займаюцца пустой балбатнёй і спасылаючыся на розныя неіснуючыя прычыны.

Я. ПРЫМІЧОЎ.

ЗВОДКА

аб ходзе рамонту трактароў і маторaў па МТМ на 30 студзеня

МТМ	Адрамантавана	Процант выканання
Клімавіцкая	73	81,1
Рагачоўская	118	75,2
Слуцкая	151	73,7
Гарадоцкая	70	69,3
Горацкая	55	68,8
Гомельская	87	60,0
Дзяржынская	86	54,4
Лепельская	64	48,9
Дамжавіцкая	61	47,7
Полацкая	37	45,1
Аршанская	74	36,1
Віцебская	25	23,0
Усяго па МТМ	902	56,4

Усебеларуская вытворчая радыёперакліччка аб разгортванні жывёлагадоўлі

ЦК КП(б)Б, ПАЛІТСЕКТАР НКЗ, НАРКАМЗЕМ І РЭДАКЦЫЯ «ЗВЯЗДЫ» СКЛІКАЮЦЬ УСЕБЕЛАРУСКУЮ ВЫТВОРЧУЮ РАДЫЁПЕРАКЛІЧКУ ПА ПЫТАННЯХ РЭАЛІЗАЦЫІ УКАЗАННЯЎ XVII З'ЕЗДА ВКП(б) І ТАВ. СТАЛІНА АБ РАЗГОРТВАННІ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ.

Перакліччка адбудзецца 10 лютага з 21 да 24 гадзіны вечара.

Асноўныя пытанні радыёперакліччкі наступныя:

1. Арганізацыя працы і аплата на малочных, свінагадоўчых, конегадоўчых і аўцагадоўчых фермах саўгасаў і калгасаў.
2. Пагрыхтаванасць ферм да 100 проц. захавання маладняка ад падыходзячых апёлаў і апаросаў.
3. Ліквідацыя бескароўнасці сярод калгаснікаў.
4. Пагрыхтоўка кадраў па жывёлагадоўлі.

У перакліччы ўдзельнічаюць сакратары РК, БП(б)Б, начальнікі палітаддзелаў МТС і жывёлагадоўчых саўгасаў, загадчыкі райземаддзелаў, зоатэхнікі, дырэктары жывёлагадоўчых саўгасаў, загадчыкі ферм, старшыні свінары і старшыні калгасаў, па чатыры ад кожнага раёна.

ЦК, Палітсектар НКЗ і Наркамзем прапануюць арганізаваць радыёслуханне па ўсіх сельсоветах, саўгасах і калгасах.

ЦК КП(б)Б. ПАЛІТСЕКТАР НКЗ, НАРКАМЗЕМ. РЭДАКЦЫЯ «ЗВЯЗДЫ».

Сусветны друк аб катастрофе стратастата „Асоавіяхім-1“

ПАЗШ

НЮ-ЮРК, 1 лютага. (БЕЛТА).

Амерыканскі друк у водгуках на нагібель удзельнікаў совецкага палёту ў стратасферу выказвае побач са спачуваннем захапленне па поваду дасягнутай імі вышыні.

«Вашынгтон пост» указвае, што «лёс трох совецкіх даследчыкаў стратасферы, набіўшых новы рэкорд вышыні і страціўшых пры гэтым жыццё, прадстаўляе сабой сучасны варыянт старажытнай тэмы аб палёце Ікара (міфалагічнага героя, прадпрыняўшага палёт на штучных крылах і загінуўшага ў часе гэтага палёту). Яны заплацілі жыццём за падъём на небывалую да гэтуль вышыню. Іх імёны, падобна імені Ікара, будуць адзначаны ў спісах тых, хто ў імя геройскага ўчынку не спыняўся ні перад чым і, страціўшы жыццё, дабіўся бяссмертнасці».

Органы газетнага трэста Херста публікуюць артыкул Брысбена, у якім гаворыцца, што «трое смелых совецкіх лётнікаў зрабілі самы высокі ў гісторыі палёт». Брысбен пад крэслівае, што «лепш памерці дзеля навуковага прагрэса, чым загінуць у несправядлівай вайне».

Бядомы амерыканскі лётнік Ван Орман выступіў з заявай, у якой выказвае

«глыбокі жаль з прычыны пагібелі мужных совецкіх лётнікаў у часе спробы здабыць каштоўныя навуковыя даныя. Асабліва сумна, што катастрофа адбылася пасля дасягнення такой выключнай вышыні».

КІТАЙ

ШАНХАЙ, 1 лютага. (БЕЛТА).

Кітайская і замежная прэса падрабязна паведаміла аб рэкордным палёце і пагібелі стратастата «Асоавіяхім—1». Газеты асабліва падкрэсліваюць, што загінуўшым совецкім даследчыкам стратасферы ўдалося падняцца на небывалую вышыню.

«Норд чайна дэйлі н'юс» піша, што совецкаму ўраду і народам СССР забяспечана ўсеагульнае спачуванне ў іх трагічнай утраце, а загінуўшым героям — дань іх адвазе, смеласці, ведам.

«Шанхай таймс» піша:

«Увесь свет выказвае свой жаль, што непраўзойдзены рэкорд, пастаўлены трыма совецкімі бясстрашнымі лётнікамі, завяршыўся катастрофай».

ЯПОНІЯ

ТОКІО, 2 лютага. (БЕЛТА).

«Джапан таймс» піша:

«Грамадская думка ўсяго свету з пачуццём найглыбейшага жалю даведалася аб трагічнай і гераічнай смерці бясстрашных вучоных, загінуўшых пры катастрофе стратастата». Указваючы, што совецкія вучоныя за поўгода двойчы падняліся ў стратасферу да не дасягнутых раней вышынь, «Джапан таймс» падкрэслівае, што абодвы палёты з'явіліся «дастойным папаўненнем ведаў чалавецтва». Палёт стратастата закончыўся гібеллю траіх — заўважае «Джапан таймс» — адпак, «іх спроба не была дарэмнай. Пакуль чалавечая адвага будзе выклікаць пашану і захапленне, імёны загінуўшых совецкіх вучоных астануцца ў памяці чалавецтва».

СКАНДЫНАВІЯ

СТАКГОЛЬМ, 2 лютага (БЕЛТА).

Скандынаўскі друк адзначае геройства загінуўшых удзельнікаў палёту ў стратасферу т. т. Федасеенка, Васенко і Ўсыскіна і вялікае навуковае значэнне іх палёту ў стратасферу.

Рад газет зміншчае інтэрв'ю Ікара, які выказвае жаль з прычыны катастрофы і адзначае, што стратастат, знаходзячыся ў стратасферы на працягу доўгага часу, як відаць зрабіў рад вельмі каштоўных навуковых назіранняў.

Шведская «Палітыкен» прысвячае загінуўшым совецкім лётнікам першыя дзве старонкі.

ІТАЛІЯ

РЫМ, 1 лютага (БЕЛТА).

Італьянскі друк, сачыўшы з вялікарнай цікавасцю за палётам стратастата «Асоавіяхім», змясціў падрабязныя паведамленні аб пад'ёме і пагібелі стратастата. Газеты выказваюць сваё спачуванне па поваду пагібелі совецкіх лётнікаў, падкрэсліваючы цяжкую ўтрату, панесеную СССР.

СПАЧУВАННЕ СЭТТЛЯ

ВАШЫНГТОН, 1 лютага (БЕЛТА).

Паўнамоцнае прадстаўніцтва СССР атрымала ад морскага камандзіра Сэттля (удзельніка пядаўняга амерыканскага палёту ў стратасферу) наступную тэлеграму:

«Майёр Фардней (другі ўдзельнік гэтага палёту) і я глыбока патрэсены паведамленнем аб пагібелі совецкага стратастата пасля бліскучай падрыхтоўкі і дасягнення рэкорда вышыні. Я ўпэўнен, што таварышы загінуўшых будуць прадаўжаць іх работу. Я прашу перадаць маё найглыбейшае спачуванне сем'ям загінуўшых».

ЯПОНІЯ

ЗАЯВА ХАЯСІ

ТОКІО, 2 лютага (БЕЛТА).

Сейюкаевец Хаттэ ўнёс у бюджэтную камісію ніжняй палаты парламента запытанне ваеннаму міністэрству аб неабходнасці прыняць меры супроць аслаблення дысцыпліны ў арміі, таксама супроць актыўнага ўдзелу рэзервістаў у палітычным жыцці. Хаттэ між іншым адзначыў, што падаўгода група адстаўных генералаў з'явілася да Саіто, патрабуючы, каб Саіто падаў у адстаўку.

Адказваючы Хаттэ, Хаясі, мяркуючы з таго, што піша газета «Асакі», па сутнасці апраўдаў удзел ваенных у палітычным жыцці, указваючы, што «сучасныя ўмовы грамадства і перажываемы надзвычайны перыяд выклікаюць небывалае абурэнне ў розумах ваенных».

Гэтае абурэнне розумаў ваенных у сучасны момант, паводле слоў Хаясі, непараўнальна больш моцнае, чым напярэдадні кітайскай і руска-японскай вайны.

«Міжнароднае становішча Японіі і ўнутранае становішча краіны, — заявіў далей Хаясі, — аказвае ўплыў на розумы ваенных. Ваенныя-ж улады, — указаў Хаясі, — не могуць умешвацца ў гэта пытанне.

ПАВЯЛІЧЭННЕ ЯПОНСКІХ ВАЕННЫХ СІЛ У ЖЭХЕ

ШАНХАЙ, 1 лютага. (БЕЛТА).

«Чайна Таймс» указвае, што японскае камандаванне накіроўвае ў правінцыю Жэхе буйныя вайсковыя часці і аграмадную колькасць зброі. Паводле слоў газеты, гэтыя захады выкліканы быццам паўстаннем войск Чан Хай-пэва ў раёне Ліньюаня.

БЕЙПІН, 1 лютага. (БЕЛТА).

Газета «Хуабейжыабо» паведамляе аб «паўстанні» войск Чан Хай-пэна (старшыня правіцельнага ўрада ў Жэхе) супроць японцаў. Газета ўказвае, што 8 батальёнаў японскіх войск накіравана з Шанхайгуаня к Цзіньчжоў

„НЕЗАЛЕЖНЫ“ УРАД У СІНЬЦЗЯНЕ

ШАНХАЙ, 1 лютага. (БЕЛТА).

Прадстаўнік сіньцзянскага правіцельнага ўрада Куп Ці-чан пацвердзіў паведамленне аб стварэнні «незалежнага» ўрада ў паўднёвай частцы правінцыі Сіньцзян.

„ДЖЭНТЛЬМЕНСКАЯ ЗГОДА“

ТОКІО, 1 лютага. (Белта).

«Дзі-Дзі» сцвярджае, што паміж Англіяй і Японіяй нядаўна заключана «джэнтльменская згода» аб вырашэнні значных палітычных пытанняў.

Згода, паводле слоў газеты, з'яўляецца рэзультатам перагавораў Хірота з Ліндлеем (англійскі пасол) у Токіо і Мацудайры (японскі пасол) з Сайманам у Лондане. Першым вынікам згоды, — піша газета, — было паспяховае завяршэнне «англа-японскіх гандлёвых перагавораў». «Джэнтльменская згода», — указвае «Дзі-Дзі», — расцэньваецца ў Японіі, як «падрыхтоўчая мера к перамаганню крызіса ў 1935-36 годзе, паколькі яна пашыраецца на ўсе пытанні, якія стаць паміж Англіяй і Японіяй».

АДКАЗ ГЕРМАНІІ АЎСТРЫЙСКАМУ ЎРАДУ

БЕРЛІН, 1 лютага. (Белта).

Нейрат перадаў аўстрыйскаму пасланніку адказ на прадстаўленне ўрада Дольфуса па поваду ўмяшання Германіі ва ўнутраныя справы Аўстрыі. Германскі адказ адкідае ўсе пункты аўстрыйскага прадстаўлення і дадае, што на думку германскага ўрада праблема аўстра-германскіх адносін не можа быць вырашана шляхам між народнага абмеркавання

АУСТРЫЯ НЕ ЗАДАВОЛЕНА ГЕРМАНСКАЙ НОТАЙ

ВЕНА, 1 лютага. (Белта).

Згодна паведамлення аўстрыйскага агенцтва, паколькі германская адказная нота ні ў якай ступені не ўлічвае высунутых аўстрыйскім урадам пратэстаў, совет міністраў лічыць яе незадавальняючай. Сяводня ўрад пад кіраўніцтвам Дольфуса будзе прадаўжаць следаваць таму шляху, які яму навязан абставінамі.

100.000 ГІШПАНСКІХ РАБОЧЫХ БАСТУЮЦЬ

ПАРЫЖ, 1 лютага. (Белта).

Як паведамляюць з Мадрыда, забастовачны рух у Гішпаніі прымае ўсё больш шырокія размеры. На сённяшні дзень у Гішпаніі бастуюць 100 тысяч рабочых. У правінцыі Толеда ўсеагульная забастоўка с.-г. рабочых, якія патрабуюць павелічэння зарплаты, пашырылася на ўсю гэту правінцыю, у якой бастуюць 40 тыс. с.-г. рабочых. Забастоўка праводзіцца па аснове адзінага фронту, які ахапляе комуністычных і социялістычных рабочых.

Усеагульная забастоўка абвешчана таксама ў Кастальоне. Тут арыштаваны члены забастовачнага камітэта. Бастуючыя пробавалі вызваліць сваіх кіраўнікоў і асадзілі турму. Адбыліся сутычкі з жандармерыяй. Налічваецца 1 забіты і 6 параненых, з іх 5 жандараў.

СТАЛІЦЫ БССР—УЗОРНЫ АЭРАКЛУБ

Кожнай школе і піонерратраду—гурток юных авіябудаўнікоў. Кожнаму заводу, фабрыцы, саўгасу, калгасу, МТС—гурток планерыстаў. Кожнаму пролетарскаму цэнтру—аэраклуб—вось задача, якую паставіў IV пленум ЦС ОАХ СССР і I усебеларускі злёт ударнікаў абарону па пытанню разгортвання авіяцыйнай культуры і прапаганды сярод шырокіх пролетарскіх мас у справе ўмацавання абарончай работы.

Менск — пролетарская сталіца БССР — павінен мець свой узорны аэраклуб з сеткай планерных гурткоў і станцый на прадпрыемствах, фабрыках і заводах з адпаведнай колькасцю планераў і вучэбных самалётаў, поўнасцю забяспечваючай запатрабаванні пролетарскіх мас.

Стварэнне ўзорнага аэраклуба, маторнага і бесматорнага лётання з шырокай сеткай гурткоў юных авіямадэлістаў у школах, піонерабазах — справа ўсёй грамадскасці.

Асоавіяхім, прафсаюзы, комсамол павінны па справе ўзначаліць справу стварэння моцнай матэрыяльнай базы Менскага аэраклуба.

Совет Народных Камісараў БССР дазволіў усім гаспадарчым, совецкім і кааперацыйным арганізацыям уступаць юрыдычнымі членамі аэраклубаў.

ЦВК БССР, надаючы велізарнае значэнне справе арганізацыі аэраклубаў, як важнейшага мерапрыемства па папулярызацыі сярод шырокіх мас працоўных ведаў і навыкаў авіяцыйнай культуры — уступіў юрыдычным членам Менскага аэраклуба, устанавіўшы свой гадавы членскі ўнос у суме 25.000 руб.

Грамадскасць наркаматаў—Паркамфіна і Паркамаўсветы на чале з наркомамі тав. Ханцевічам і тав. Чэргушэвічам—уступіла юрыдычным членам Менскага аэраклуба, устанавіўшы сабе гадавы членскі ўнёсы па 10.000 руб. у год.

Першы крок зроблен.

Паспяховае стварэнне матэрыяльнай базы для Менскага аэраклуба праз юрыдычнае членства совецкіх, гаспадарчых і кааперацыйных арганізацый і шляхам прыцягнення да гэтай справы шырокай пролетарскай грамадскасці, лепшых ударнікаў рабочых, служачых, у першую чаргу комсамольцаў, вярбоўкі сапраўдных членаў аэраклубу, — вось канкрэтныя задачы кожнай ячэйкі КСМ, ФЗМК і ячэйкі Асоавіяхіма на кожным прадпрыемстве, установе і арганізацыі.

ЦС АСО БССР САКАЛОЎСКІ.

Аб юрыдычным членстве гаспадарчых, совецкіх і кааперацыйных арганізацый у стралковых і аэраклубах

Пастанова Совета Народных Камісараў БССР

Падаючы выключна важнае значэнне разгортванню аэраклубаў, планерных станцый і стралковых клубаў, як адной з важных галін удасканалення абарончай работы па лініі Асоавіяхіма, Совет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Дазволіць усім гаспадарчым, совецкім і кааперацыйным арганізацыям уступленне юрыдычнымі членамі аэраклубаў і стралковых клубаў.

Выдаткі па выплаце членскіх узносаў пакрываюцца за лік агульных асігнаванняў па кантарысах і фінпланах гаспадарчых, совецкіх і кааперацыйных арганізацый, прызначаных на адміністратыўна-гаспадарчыя расходы.

2. Даручыць ЦСПСБ абмеркаваць пытанне аб юрыдычным членстве профсаюзаў у стралковых і аэраклубах Асоавіяхіма.

3. Прапанаваць горсоветам і райвыканкомам прадаставіць асоавіяхімаўскім і комсамольскім арганізацыям неабходныя памяшканні, зямельныя плошчы пад аэрадромы, планерадромы, аэраклубы і стралковыя клубы.

Нам. старшыні Совета Народных Камісараў БССР А. БАЛЦІН.

Нам. кіраўніка справаў Совета Народных Камісараў БССР А. МАЦКО.

Пастанова прэзідыума ЦВК БССР

Падаючы велізарнае значэнне справе арганізацыі аэраклубаў, як важнейшага мерапрыемства па папулярызацыі сярод шырокіх мас працоўных ведаў і навыкаў авіяцыйнай культуры, прэзідыум ЦВК БССР пастанаўляе:

1. Ухваліць мерапрыемствы Асоавіяхіма па арганізацыі аэраклубаў у Менску, Вітебску, Гомелі, Бабруйску і Оршы.

2. Ухваліць пароўнае ўцягнення ўстаноў і арганізацый у справу арганізацыі аэраклубаў, шляхам устанаўлення юрыдычнага членства.

3. Уступіць у якасці юрыдычнага члена Менскага аэраклуба, асігнаваўшы на гэту справу 25 тысяч рублёў.

4. Прапанаваць усім РВК і горсоветам разгарнуць масавую работу па аказанню садзейнасці справе арганізацыі аэраклубаў, з таксама прыцягнення юрыдычных членаў.

5. Прапанаваць Менскаму горсовету вызваліць для Менскага аэраклуба адпаведнае памяшканне.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР ЛЕЎКОЎ.

ГАРПРОФСОВЕТ скліча **4-га лютага,** у 7 гадзін вечара,

у памяшканні Гарпрофсовета (пакой № 1)

НАРАДУ СТАРШЫНЬ ФЗМК, КУЛЬТРАБОТНІКАЎ І СТАРШЫНЬ ШЭФКУСТОЎ

па пытанню

АБ НОВЫМ КУЛЬТЗБОРЫ на 1934 г.

З прычыны важнасці пытання яўка абавязкова і без спазнення.

ГАРПРОФСОВЕТ.

ЛЕСАВЫВАЗКА

Чаму зрываецца лесавывазка па Клімавіцкаму раёну

Заданне Клімавіцкага раёна на 1 квартал па лесавывазцы складае 22.000 кбм. пасаматэрыялу і 32.000 рм. дроў.

Пры каяўнасці па с.-г. сектару раёна 10.000 працаздольных коняй, на кожнага каня прыпадае вывазці 2,2 кбм. пасаматэрыялу і 3,2 рм. дроў, або 7-8 працадзён за квартал.

Пры нармальнай працы ў лесе (50-60 рабочых дзён за квартал) за данне раёна можна выканаць 1.400—1500 кубамі, або 12-14 проц. цягавай сілы раёна.

Не можа быць ніякіх разважанняў аб немагчымасці вызначыць на лесавывазку паказаную колькасць гужсілы.

Вынікі-ж працы за 2 першыя дэкады квартала (вывезена пасаматэрыялу 1925 кбм.—8,75 проц. плана і дроў 4.927 кбм—15,4 проц. плана), не гледзячы на даволі спрыяльныя ўмовы (маласнежнасць, адсутнасць зацей) ужо зараз намячаюць прарыў выканання плана першага квартала.

У чым прычына?

Галоўнай прычынай такой працы з'яўляюцца недастатковыя клопаты аб лесавывазцы з боку раённых кіруючых арганізацый, якія лічаць гэтую справу нейкай «другараднай». Не выпадкова, што пры пасылцы на раён у пачатку студзеня ўпоўнаважаных РК і РВК пытанне песа вывазак у складзенай для іх памятцы «памылкова» зусім не ўключана.

РК і РВК паслалі сельсоветам шмат дырэктыў аб узмацненні лесавывазкі. Але за выкананне гэтых дырэктыў адказнасці ніхто не адчувае, бо раённыя арганізацыі толькі гэтым абмяжаваліся.

Заключаныя паміж калгасамі і леспрамгасамі двухбаковыя гаспадарчыя дагавары на лесавывазку астаюцца кавалкамі паперы.

Зусім не выпадкова, калі пры гэтых умовах план лесавывазак па Гусарскаму сельсовету за 2 дэкады выканан на 1 проц., а па Звенчацкаму, Галіцкаму, Дубравіцкаму і Лазовіцкаму на 3-4 проц.

Кулацкія разважанні аб нерэальнасці плана лесавывазак папуляризуюцца нават адказнымі работнікамі сельсоветаў і калгасаў (Звенчацкі с.-с. — старшыня МІХЕЕНКА, Кісялёвабудзянскі сельсавет — старшыня ХОМЧАНКА, калгас «Рабочы»—старшыня КУЛЯШОЎ, Мілаславіцкі сельсавет, калгас імя Сталіна — старшыня НЕСЦЯРЭНКА і інш.). Пры такіх разважаннях вярхушкі сельсоветаў і калгасаў кулацкая агітацыя супроць лесавывазак патрэбнага адпору не сустракае.

Усе разважанні аб нерэальнасці планаў лесавывазкі ўшчэнт разбіваюцца ўдарнай работай перадавых сельсоветаў і калгасаў раёна, якія на аснове сапраўднай барацьбы з кулацкім сабатажам лесавывазкі і разгорнутага соцспаборніцтва дасягнулі значных поспехаў (за 2 мінулыя дэкады план 1 квартала выкананы Аўтухоўскім сельсоветам на 52 проц., Забялышанскім—на 38 проц. аддзяленнем Красоўка калгаса «Рабочы» — на 70 проц., у той час як калгас у цэлым план выканаў на 5 проц.).

Не гледзячы на заўвагу тав. ГАЛАДЗЕДА аб недапушчальнасці слабай папулярызацыі лесавывазкі раённым друкам, раённая газета «КОМУНА» пад гучнымі назвамі «Сустрэць XVII партз'езд паспяховым выкананнем лесавывазкі», «Студзень вырашае поспех лесавывазкі» друкуе скалочніцкія матэрыялы работнікаў леспрамгаса адзін на другога, не ўваходзячы ў сапраўднае становішча ходу выканання плана лесавывазкі, не шукаючы сапраўдных прычын ганебных тэмпаў і не папулярызуючы сапраўднай большэвіцкай барацьбы перадавых калгасаў і сельсоветаў.

Міма старонак «Комуны» праходзяць такія абвяржаючыя факты, пад рываючыя лесавывазку: а) спайвання дынатуратам возчыкаў з боку клімавіцкага рэйтэзавода і броваравў Міхайлоўскага, Пайлавіцкага Высокаўскага з мэтай адрыву ад выканання лесавывазкі леспрамгасам і вярбоўкі на свае перавозкі.

б) Самачынны перавод загадчыкам райвашчадкасы Вайсбергам і пад яго націскам старшынямі калгасаў на пакрыццё запазычанасці калгасаў за пазыку Індывідуальнай зарплаты возчыкаў, у неналькі разоў правышаючай іх падпіску, у выніку чаго ў калгаснікаў існуе погляд, што лесавывазка не аплачваецца (Кісялёвабудзянскі, Мікеевіцкі, Студзянецкі і інш. сельсоветы раёна).

в) Безадказныя выступленні кіруючых работнікаў раёна на калгасных сходах (член бюро РК тав. ХАЙКІН на калгасным сходзе ў калгасе «Чырвоны арэты» заявіў, што горкамбінат аплачвае сваю лесавывазку па 5 руб. і 8 кгр. хлеба за кубаметр дроў. Гэта не было выканана, і зараз калгаснікі заўважаюць, што за лесавывазку плоцяць абяцаннямі).

Пры такіх адносінах да лесавывазкі ў Клімавіцкім раёне трудна чакаць паспяховага выканання плана.

Брыгада Леспрамгаса.

ВЫКАНАЕМ ГАДАВЫ ПЛАН ДА 15 ЛЮТАГА

ДА ЎСІХ КАЛГАСНІКАЎ І ПРАЦОЎНЫХ АДНААСОБНІКАЎ КАСЦЮКОВІЦКАГА І КЛІМАВІЦКАГА РАЁНАЎ І ЎСЕЙ БССР.

Лесазагатоўкі і вывазка з'яўляюцца важнейшай гаспадарча-палітычнай справай, асабліва ва ўмовах БССР, якая займае адно з асноўных месц сярод пастаўшчыкоў будматэрыялаў новым гігантам індустрыі і забяспечвае апалам прамысловыя рабочыя цэнтры.

Наш Касцюковіцкі раён скончыў 1933 год з вялікім прарывам. Кепска выконвае раён свой план і ў першым квартале 1934 г. (вывазка драўніны за 25 дзён студзеня складае 58,2 проц. месячнага плана, а вывазка дроў — 54,9 проц.). Гэты прарыў адбыўся ў выніку неарганізаванасці і самацёку ў рабоце раённых арганізацый.

Нашы калгасы — «Большэвік» і «III Інтэрнацыянал» ідуць наперадзе іншых: план лесазагатовак і вывазкі 4-га квартала 1933 г. мы выканалі датэрмінова из 10 дзён — 20 снежня. Добра ўсвядоміўшы значэнне лесавывазкі 1934 г., мы заключылі двухбаковыя гаспадарчыя дагаворы, правялі шырокую палітмасавую работу, правільна арганізавалі работу сквазных брыгад, правільна расставілі рабочую і цягавую сілу і наладзілі добрасумленныя адносіны да каня. У аснову ўсёй работы мы паклалі **социялістычнае спаборніцтва** паміж нашымі двума калгасамі, а таксама ўнутры сквазных брыгад. Усё разам дало нам магчымасць выканаць **увесь план лесавывазкі 1934 г. за 23 дні** — гэта значыць 23 студзеня. Калгас **«III Інтэрнацыянал»** даў па загатоўках 103 проц. па вывазцы 100 проц.; калгас **«Большэвік»** — па загатоўках 104 проц. і па вывазцы 101 проц.

Зараз у гонар **XVII партз'езда** мы, калгаснікі арцеляй **«Большэвік» і «III Інтэрнацыянал»** высунулі **сустрэчны план**, абавязаўшыся вывезці дадаткова **па 200 кбм. пасаматэрыялаў** і вылучыць у дапамогу адстаючым калгасам моцныя брыгады для арганізацыі справы лесавывазкі па нашаму прыкладу.

Заклікаем вас, таварышы калгаснікі і працоўныя аднаасобнікі, мабілізаваць усе свае сілы на лесавывазку, пабольшэвіцку ўдарыць па кулацкаму сабатажу і разважанням аб нерэальнасці планаў і выканаць гадавы план НЕ ПАЗНЕЙ 15 ЛЮТАГА 1934 г., што з'явіцца лепшым падарункам XVII партз'езду і лепшым стымулам у падрыхтоўцы да другой большэвіцкай вясны другой пяцігодкі.

НЯХАЙ ЖЫВЕ XVII З'ЕЗД ВКП(б)!

НЯХАЙ ЖЫВЕ ПЕРШЫ КАЛГАСНІК-УДАРНІК ТАВ. СТАЛІН!

Па даручэнню калгаснікаў: БЕСПЛАЎ, БАРАВІК, ЕРМАКОЎ, ГРОМАЎ, БАШКІРАЎ, КУРЫЛОЎСКІ, ДЗЯДЗЯЧКІН, ЦЕСЕНКА, ГРЫБЕНКОЎ і інш.

ПАВЕДАМЛЕННІ

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б паведамляе, што 4 лютага 1934 г. у 10 гадз. раніцы будзе засядаць Рэспубліканская камісія (дом Урада, правае крыло, 2-гі паверх, пакой 266) па разгляду апеляцый па рашэнні Менскай гарадской камісіі па чыстцы КП(б)Б наступных т. т.:

Турчын Р. В. (яч. Белторфа), Гінедзін П. Ш. (яч. школы міліцыі), Громыка К. Я. (партарганізацыя ваеннага дэпо Менскага чыгуначнага вузла), Дземяшкевіч І. У. (яч. школы міліцыі), Зубчонак Я. М. (яч. Белзагатжывёлы), Кісялёў Д. П. (яч. Дзяржбанка), Кантароніч Г. Е. (партк. фабрыкі імя Кагановіча), Калеснікаў П. А. (яч. паштова-чыг. аддз.), Ліўшыц С. І. (яч. Белкаапромсовета), Юшкевіч С. І. (яч. Яноўскага с-совета, Асіпавіцкага раёна), Шафран Я. Д. (Лепель), Салей М. Е. (яч. Аўтадора), Турэцкі М. Н. (Малпромтрэста), Межыцкі І. С. (яч. ЦСПСБ), Кавалёў І. Ф. (Асіпавічы), Стаскевіч У. Т. (яч. МТС), Акуловіч М. Н. (яч. Белгандля), Кандраценка І. С. (Асіпавічы), Байкоў І. Т. (Горкі), Фіш Э. В. (яч. дома Урада), Сімановіч А. І. (яч. Белхарчпромсаюза), Севасцянаў Ф. Г. (яч. МГРК), Рапапорт М. Я. (яч. Белдзяржбуда), Зелінскі С. А. (яч. Лесбела), Масакоўскі А. А. (яч. Палітэхнічнага інстытута), Кавалёў К. І. (яч. завода імя Варашылава), Карповіч П. Ф. (яч. НКФ), Канашэвіч М. Ф. (Барысаў), Гінзвіч А. І. (яч. службы шляху), Малочка І. С. (яч. садова-гароднага інстытута), Логвін А. Ф. (яч. завода малочных кіслот), Мядзведзеў І. Т., Авілін П. І. (ячэйка Саюзмаслапрома), Каценко А. А. (ячэйка вагоннага дэпо), Вайнтрауб І. М. (ячэйка фабрыкі «8 сакавіка»), Рыўкін Х. М. (ячэйка фабрыкі «8 сакавіка»), Ланідус Г. Х. (яч. курсаў тэхн. БМА), Ледэр Г. І. (яч. сталовай № 1), Яскевіч М. Ф. (яч. працасветы), Шапачнікаў Г. А. (яч. зав. «Чырвоны тэкстыльшчык»), Пяршко П. І. (яч. Палітэхнічнага інстытута), Хмель Н. Д. (яч. завода «Пролетарый»), Санберг Г. І. (яч. Белкаапсаюза), Паліцкая Т. Г. (яч. хлебаканторы Белгандля), Нядзелько П. Я. (яч. Белпалдагародніны), Нахімовіч С. Ш. (яч. Белдзяржбуда), Ліберман М. Л. (яч. мец. адда. Белгандля), Лімапоўскі І. М. (яч. рэд. газеты «Звязда»), Кісялёў А. М. (яч. совгаса імя Лекерта), Крук В. Т. (яч. БДУ), Каратке́віч А. Ф. (яч. завода «Комунар»), Захараўскі П. М. (яч. дзіцячай клінікі), Ефімаў В. Г. (яч. Наркамснаба), Дыкштэйн Г. Ш. (яч. Загатзарно), Двойных В. А. (яч. трэста гасцініц), Разман М. Л. (яч. кушнерная фабрыкі), Глазман Б. Н. (яч. ЦСПСБ), Гаранскі А. А. (ВКСТШБ), Гарэльчык П. К. (ін-та Прамхарч), Гурынкаў Ф. Я. (яч. завода стандартных дамоў), Верасаў Р. М. (яч. завода «Ударнік»), Ворон М. П. (яч. БелАН), Бурый Н. В. (яч. Наркамцяжпрама), Барысевіч І. М. (яч. МТС), Турэцкі А. І. (яч. кушнернай фабрыкі), Турыпа С. М. (яч. завода «Чырвоны тэкстыльшчык»), Трушкевіч Ф. Т. (яч. прыгараднага сельсовета), Юркоў А. А. (яч. завода імя Мяснікова), Бледзько М. Т. (яч. Трасцянецкага сельсовета), Быкоўскі В. І. (яч. Астрашыцка-Гарадзецкага сельсовета), Александровіч В. А. (яч. Бульбатрактарацэнтра), Батвінік О. Н. (яч. паштова-газетнай канторы), Будаеў І. Д. (яч. НКЗВБ), Крукоўскі А. О. (яч. БелАН), Меламед А. І.

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б.

***

Ніжэйпералічаныя таварышы, якія па розных прычынах не прайшлі чысткі партыі, павінны 5 лютага ў 10 г. раніцы з'явіцца ў МенгорКК (вул. К. Маркса, 14, пакой 24) для ўстанаўлення ім часу праходжання чысткі.

Павінны з'явіцца т. т.: Араноўіч Я. Б., Вайтовіч А. Г., Юнцевіч І., Радзенкі С. Р., Іваноў Н. М., Шчуровіч А. С., Васілеўскі П. П., Тратасевіч А. І., Барабанаў В. Я., Ляшнеўскі Ц. Я., Малашонак Н. С., Меркуловіч С., Тарноўскі Е. Г., Рудбольц Г. І., Запольскі П. Н., Клепова, Маларская Ж. А., Вайцяхоўскі М. Ю., Бобра М. Ф., Войтус Е. Л., Арцютоў І. С., Запольскі П. Н., Гучка П. С., Сандлер Д. А.

МенгорКК КП(б)Б.

***

ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 6 лютага ў 10 г. раніцы ў гор. **КРЫЧАВЕ** парткамісіяй ЦКК КП(б)Б будуць разглядацца партсправы наступных т. т.

Па Крычаўскаму раёну, 6 лютага.

Абрамаў С., Свадкоўскі А. Ф., Клюпко В. Я., Цыганкоў М., Белы М. А., Чмяхоў М. Г., Зайцаў М. В., Кісялёў М. Д., Архіпаў Ф. Н., Мяжкоў Г. А., Вертліб М. Н., Давідзенка П. О., Міхненкоў Г. Д., Ушаў М. Я.

Па Касцюковіцкаму раёну, 6 лютага.

Зайцаў М. Я., Максімаў П. С., Малеванаў А. П., Бабакін П. Л., Лістроценка Я. Ф., Шкаленка С. М., Кавалёў А. С., Мэрусаў С. А., Шчыслёнак А. М., Зайцаў П. Н., Шармалаева А. В.

Па Клімавіцкаму раёну, 6 лютага.

Сухарукаў М. Л., Харытонаў М. С., Грынчанка П. С., Несцераў П. П., Андрэйчыкаў П. А., Салдаценка І. С., Чарткоў Х. М., Касцешка Г. Ф., Кучынскі Н. П., Стальмакоў А. Д., Ісачэнка А. Н., Якубенка В., Мінчэнка В. Ф., Жарнаў І. Ф., Прынчнаў І. К., Сенькін М. А., Новікаў Н. І., Давідаў М. С., Прудзінкоў Г., Парпукоў Я. Ц., Кашпешка Я. А., Свірыдаў Л. Ф., Бурылаў І. М., Блохін С. М., Балтуноў Я., Палівін Г. Н., Неймарк Е. А.

Яўка выкліканых т.т. абавязкова. Пры яўцы на парткамісію трэба мець пры сабе характарыстыку парт'ячэйкі аб сваёй апошняй рабоце.

***

ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 8 лютага ў г. **ЧЭРЫКАВЕ** будзе працаваць выязная партканісія ЦКК КП(б)Б па разгляду партсправаў Чэрыкаўскага раёна наступных т. т.:

Львоў Д., Шрамоў І. Е., Белазераў І. Ф., Сцелькін В. К., Еўдаімешка К. А., Астапаў Ю. Я., Буглакоў М. А., Брынцэвіч П. К., Давідаў П. С., Грыбкоў Я. І., Сафеенка А. П., Праянцоў Я. Я., Трафімаў Г. Я., Егораў Д. І., Ермакоў Я., Козыраў Г. А., Радкоўскі, Болуцевка І. М., Майсеў П. П., Пудзешкоў Ф. Л., Бездзік С. Р., Васількоў Ф. М., Еранкоў Г. С., Новікаў, Ліпоцеў І. В.

Яўка пералічаных т.т. абавязкова.

***

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б паведамляе, што 7 лютага 1934 г. у г. Магілеве адбудзецца пасяджэнне Рэспубліканскай камісіі па чыстцы КП(б)Б па разбору апеляцый на рашэнні Чавускай, Шклоўскай, Бялыничскай, Кармянскай, Быхаўскай, Рагачоўскай і Магілёўскай райкамісій наступных таварышоў:

На 7 лютага 1934 г. у г. Магілеве

Лурыкаў К. М., Дзенісенкаў В. Е., Анішчанка Г. С., Шаронаў А. І., Бакшарымаў П. Х., Баранькоў Е. І., Зноскаў Е. С., Барфаламеєў С. І., (Чавусы), Раманькоў С. М., Свірыдзенка С. М., Роут І. Ф., Чумакоў Д. Г., Берасцёў І. Л., Грыцук Е. І., Літвінаў В. Е., Крушенько І. І., Кістач А. П., Лужанкоў І. М., Нікіпін П. С., Тішкоў І. П., Гардаш Ф. М., Дударэў В. В., Булкіна С. С., Рашчэнка І. А., Ельскі Ф. А., Фесько Н. Ф., Мільто З. В., Кірсанаў І. М., Бутрамеєў Ф. Ф. Побаль І. А., Аладзьеў П. П. (Шклоў); Старавойтаў К. Е., Старавойтаў К. І., Бураўкова А. М., Скачкоўскі І. П., Сасонка С. Е., Шамітовіч П. П. (Бялынічы); Ларчэнка А. А., Касцюшэнка В. М., Калмановіч Г. М., Калашкаў Н. Я., Ліфіменка Н. П., Салаўеў Т. Т. (Карма); Трызна В. І., Лапіцкі М. С., Дзедзюлін І. Ф., Кубарава Е. Н., Баранаў І. С., Халадцоў Я. Ф., Тімафеєў А. С., Старавойтаў С. Е., Кульшоў М. С., Кірэйкоў Н. С., (Быхаў); Фурсянкоў І. М., Савельеў Т. І., Омелькін Б. І., Крушенько С. К., Феськоў С. М., Кістайчык С. Г., Кагаа Л. І., Грэхоўскі І. Ф., Гінзбург Л. І. (Рагачоў); Сеўкоў П. Т., Мішькоў С. Ф., Шоскі М. Ш., Чэснок А. І., Карпяк І. С., Казлоў П. В., Кас'янаў Д. Н., Багдаёўская А. С., Дамаскаў А. І., Лазарэнка А. М., Альтэйчыкаў С. І., Ярошчанка П. А. (Магілёў).

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ.

***

Рэспубліканская Камісія па чыстцы КП(б)Б паведамляе, што 8 лютага 1934 г. у г. Барысаве адбудзецца пасяджэнне Рэспубліканскай камісіі па чыстцы па разгляду апеляцый на рашэнні Крупскай, Барысаўскай, Бягомльскай, Плешчаніцкай райкамісій наступных т.т.:

Варановіч Р. А., Плаксёнак М. А., Рабцевіч Ф. Я., Каралькоў Я. М., Эзер А. З., Кур'ян І. Р., Шукайло Ц. В., Валаховіч М. В. (Крупкі); Лобыш К. В., Дудуренак І. П., Сенко Д. Т., Петроўскі А. Л., Радкевіч А., Поляк С. К., Радзевіч М. К. (Бягомль); Палкоўскі П. І. (Плешчаніцы); Петракоў С., Федасеєў П. Ф., Хадасевіч А. М., Гайдук Н. І., Лесун І. Г., (Барысаў).

**Рэспубліканская камісія па чыстцы К